**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**

**Установа адукацыі**
**“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт**
**імя Францыска Скарыны”**

**В. А. Ляшчынская**

# ТЭКСТ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

**Практычны дапаможнік**
***для студэнтаў***
***філалагічных спецыяльнасцей ВНУ***

**Гомель 2008**

УДК 811.161.3(072)(075.8)
ББК 74.268.11 я 73
Л 99

Рэцэнзенты :
З. У. Шведава, дацэнт кафедры беларускай мовы УА "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны", кандыдат філалагічных навук;
Н. В. Філімонава, настаўніца беларускай мовы і літаратуры ДУА "Гімназія бізнесу і права № 51 г. Гомеля"

Рэкамендавана да выдання навукова-метадычным саветам установы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны"

**Ляшчынская, В. А.**

Л 99 Тэкст на ўроках беларускай мовы : практычны дапаможнік для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей ВНУ / В. А. Ляшчынская; М-ва адукацыі РБ; Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф.Скарыны, 2008. – 64 с.

ISBN 978-985-439-333-9

У прапанаваным дапаможніку апісаны прыкметы, тыпы і законы пабудовы тэкстаў, прапанаваны ўзоры арганізацыі тэкставай дзейнасці вучняў у сувязі з вывучэннем розных тэм школьнага курса беларускай мовы. Аўтар імкнецца арганічна звязаць праграмны матэрыял, які вывучаецца на ўроках беларускай мовы, з работай над тэкстам, што дазволіць выпрацаваць практычныя навыкі і ўменні вучняў правільна будаваць тэксты.

Дапаможнік адрасаваны студэнтам філалагічных спецыяльнасцей ВНУ, настаўнікам беларускай мовы школ, гімназій і ліцэяў.

УДК 811.161.3(072)(075.8)
ББК 74.268.11 -3

ISBN 978-985-439-333-9

© Ляшчынская В. А., 2008
© УА “ГДУ імя Ф. Скарыны”, 2008

*Самы радасны прадмет –*
*спасцігаць загадку слова,*
*роднае зямелькі мову*
*на ўроку,*
*у жыцці,*
*каб лягчэй было ісці*
*і каб сілу мець душою*
*праз жыццё –*
*за годам год, –*
*што зямля твая –*
*з табою,*
*што з табою –*
*твой народ!*
Г. Пашкоў

## УВОДЗІНЫ

Задача навучання мове – навучыць змястоўна, граматычна і стылістычна правільна выражаць думкі, свабодна карыстаючыся сродкамі мовы ва ўсіх сферах жыцця. Вось чаму пытанне аб развіцці маўлення як метадычнага, лінгваметадычнага пытання патрабуе размежавання паняццяў *мова* і *маўленне*, і, апіраючыся на яго, у методыцы адрозніваецца вывучэнне сістэмы мовы і вывучэнне функцыянавання мовы; вывучэнне сістэмы моўных паняццяў і вывучэнне функцыянавання, прымянення, выкарыстання моўных сродкаў.

Развіццё маўлення на ўроках беларускай мовы – гэта ўся праца, якая праводзіцца настаўнікам спецыяльна на ўроках па развіцці маўлення і ў сувязі з вывучэннем усіх раздзелаў школьнага курса (фанетыкі, марфемікі і словаўтварэння, лексікі і фразеалогіі, марфалогіі і сінтаксісу, арфаграфіі і пунктуацыі) для таго, каб вучні авалодалі моўнымі нормамі (арфаэпічнымі, арфаграфічнымі, акцэнталагічнымі, лексічнымі, фразеалагічнымі, словаўтваральнымі, марфалагічнымі, сінтаксічнымі), каб умелі і маглі выражаць свае думкі ў вуснай і пісьмовай формах, карыстаючыся патрэбнымі моўнымі сродкамі ў адпаведнасці з мэтай, зместам маўлення і ўмовамі зносін.

Авалодванне маўленнем цесна звязана з выхаваннем асобы вучня, асобы будучага грамадзяніна краіны, бо найпершым паказчыкам кожнага чалавека, кім бы ён ні быў, кім бы ні працаваў,

з’яўляецца ўзровень яго маўлення, маўленчай культуры, дзе выяўляецца амаль што ўсё.

Арганізацыя маўленчай дзейнасці без апоры на прынцып тэкставага навучання ці ўвагі да тэксту, без апоры на тэкст у яго жанрава-стылістычнай разнастайнасці сёння немагчыма. Але неабходна арганізацыя такой працы, якая патрабавала б вывучэння моўных адзінак розных узроўняў на матэрыяле тэкстаў шляхам выяўлення ў іх месца і ролі адзінак мовы ў маўленні, з аднаго боку, і з другога – прыводзіла да складання тэкстаў як выніку навучання, г. зн. на аснове атрыманых ведаў, выкарыстаных тэкставых узораў выпрацоўваліся практычныя ўменні маўленчай дзейнасці – будаваць тэкст паводле звестак, правіл пра тэкст, пра яго будову, тып, стыль, жанр і ў адпаведнасці з гэтым ужываць пэўныя моўныя сродкі ў іх сукупнасці, якія адпавядалі б мэтазгоднасці, правільнасці, дакладнасці, дапушчальнасці ў пэўнага тыпу выказваннях. Каб на самой справе дапамагчы вучням авалодаць усімі гэтымі ўменнямі, настаўніку неабходна скіраваць сваю ўвагу да лінгвістыкі тэксту, у прыватнасці да сінтаксісу тэксту, у выніку чаго па-новаму арганізаваць навучанне граматыкі – на аснове сінтаксісу тэксту. Прапанаваная вучням сістэма ведаў па мове патрабуе выдзялення ў якасці цэнтральнага паняцця тэкст.

Мэта і задачы прапанаванага вучэбна-метадычнага дапаможніка – скіраваць увагу ўсіх, хто займаецца навучаннем беларускай мовы, да праблем арганізацыі тэкставай дзейнасці і іх вырашэння на занятках па беларускай мове; выявіць далёкія ад вычарпальнасці рэсурсы, закладзеныя ў праграмным матэрыяле, і дапамагчы настаўнікам і студэнтам філалагічных факультэтаў як будучых настаўнікаў беларускай мовы такой арганазацыі навучання, якая дазваляла б выпрацоўваць практычныя навыкі і ўменні звязанага маўлення вучняў, вучыла б карыстацца імі на аснове атрыманых тэарэтычных ведаў, тых законаў і правілаў навукі аб мове, аб яе адзінках з улікам іх ролі і месца ў маўленні, іх уласцівасцей як адзінак і сродкаў арганізацыі тэкстаў.

# 1 ПРЫКМЕТЫ ТЭКСТУ

Тэкст выступае найперш як пэўнае завершанае паведамленне, якое валодае сваім зместам (інфармацыя тэксту), сваім сэнсам (выражэнне асноўнай думкі, пэўнага меркавання), арганізаванае паводле мадэлі адной з існуючых у літаратурнай мове формы паведамлення (функцыянальнага стылю, яго разнавіднасці і жанру) і якое характарызуецца сваімі прыкметамі.

Адной з прыкмет тэксту з’яўляецца яго інфармацыйнасць, ці яго змест, хаця не заўсёды можна паставіць знак роўнасці паміж паняццямі, абазначанымі тэрмінамі “інфармацыя” і “змест” тэксту.

Праз тэксты вучні далучаюцца да ведаў, да разнастайных звестак, назапашаных людзьмі за гады і стагоддзі практычнай і тэарэтычнай дзейнасці, што асабліва важна для падрыхтоўкі і ўдзелу вучняў у сацыяльным жыцці, для сумеснай з іншымі сацыяльнай дзейнасці.

Змест тэксту цесна звязаны з яго формай выражэння. Катэгорыя зместу тэксту ўключае два асноўныя паняцці – тэма (прадмет тэксту, тое, пра што апавядаецца, апісваецца, разважаецца) і ўласна змест, суадносіны паміж якімі могуць мяняцца ў розных тыпах тэкстаў. Так, у тэкстах афіцыйна-справавой і навуковай сфер тэма і змест вельмі блізкія і могуць нават супадаць. Тэма можа быць сфармулявана ў назве, ці загалоўку, тэксту або ў самым пачатку тэксту. Напрыклад, тэкст “Даверанасць” як афіцыйна-справавы дакумент ужо самой назвай выяўляе яго тэму, а змест яго – удакладненне таго, хто каму і што давярае зрабіць, выканаць і пад.

У газетных артыкулах адносіны паміж загалоўкам і зместам больш складаныя і могуць быць нават супярэчлівымі. Напрыклад, у газеце “Звязда” змешчана наступнае паведамленне:

*Навука цаной у $323 тысячы*

*Праваахоўнікамі на аўтадарозе Мінск – Магілёў паблізу Беразіно былі затрыманы аўтамашыны, якія перавозілі з тэрыторыі Расіі нафтапрадукты – 140 тон дызельнага паліва і 32 434 літры бензіну нармаль-80 – па суправаджальных дакументах, якія не адпавядалі рэчаіснасці. Транспартныя сродкі і нафтапрадукты, агульным коштам 323 500 долараў канфіскаваны. Штраф – 28 мільёнаў рублей.*

Прачытаўшы загаловак прыведзенай вышэй газетнай інфармацыі, адразу па-рознаму можна меркаваць пра яе змест: гэта кошт за навучанне каго-небудзь, гэта сума атрымання хабару за навуку і інш. Але, прачытаўшы ўвесь тэкст, відавочным становіцца яго змест: цана штрафу за парушэнне як кара і навука на будучае.

У выніку ўзаемадзеяння тэмы і зместу ўзнікае новае паняцце іншага ўзроўня – ідэя, ці асноўная думка. Праілюструем яго наступным тэкстам:

*Гняздо ў траве*

*Аднойчы раніцай я пайшоў у грыбы. Хаджу, прыглядаюся. Раптам з-пад ног маіх пырхнула маленькая птушка – пеначка. Яна замітусілася над маёй галавой і трывожна заценькала:*

*– Цень-цень-цінь-цінь!..*

*Я прысеў на мяккі верас, уважліва паглядзеў вакол сябе і знайшоў у траве птушынае гняздзечка. У гняздзечку пішчалі птушаняты.*

*– Жывіце на здароўе, – сказаў я ім і пайшоў далей ад гнязда.*

*А дні праз тры я зноў трапіў на тое месца. Успомніў пра гняздо пеначкі і зайшоў зірнуць. Глянуў і здзівіўся. Гняздо, якое было так добра захавана ў верасе, цяпер узвышалася над ім. Я спачатку падумаў, што гэта работа нейкага свавольніка. Але яшчэ больш здзівіўся, калі нагнуўся ніжэй. Гняздзечка ляжала на шапцы вялікага грыба баравіка. Грыб рос з зямлі і падняў яго.*

*Птушаняты к гэтаму часу паўбіраліся ў пер'е і на віду ўсяго лесу не дужа спакойна сябе адчувалі. Паблізу трывожна лёталі птушкі-бацькі.*

*– Ах ты, шкоднік, – засмяяўся я, зрэзаў баравік і паклаў яго ў кошык. – Мала табе месца ў лесе было?*

*А гняздо на ранейшае месца палажыў і прыцерушыў яго лісцем. Няхай гадуюцца птушаняткі.* (Паводле В. Хомчанкі)

Тэма тэксту – “гняздзечка пеначкі на грыбе”, што часткова і адлюстравана ў назве тэксту, а асноўная думка яго – беражыце ўсё жывое (*Няхай гадуюцца птушаняткі*).

Катэгорыя формы ўключае свае два паняцці – кампазіцыю і мову, якія, як тэма і змест, узаемадзейнічаюць, актыўна суадносяцца адно з другім. Разам узаемадзеянне тэмы і зместу, кампазіцыі і мовы ў іх перапляценнях дае структуру тэксту. Агульны характар выкладу, яго стыль вызначаецца моўнымі адзінкамі і кампазіцыяй. Менавіта кампазіцыя забяспечвае звязанасць, цэласнасць і завершанасць тэксту.

Паняцце звязанасці тэксту як яшчэ адной прыкметы найбольш поўна выяўляецца праз вылучэнне звышфразавых адзінак і выяўленне спосабаў аб'яднання самастойных сказаў у межах звышфразавых адзінак і звышфразавых адзінак паміж сабой. Звязанасць забяспечваецца сэнсавай сувяззю паміж сказамі, паміж звышфразавымі адзінствамі тэксту, паміж адносна самастойнымі часткамі тэксту, а гэта сувязь выражаецца з дапамогай розных відаў і моўных сродкаў: лексічных (паўтор лексемы, замена сінонімам, займеннікам, займенным словам, эліпсіс, умаўчанне), граматычных (парадак слоў, трывальна-часавая сістэма дзеясловаў, ступені параўнанняў, пытальна-адказавая форма, сінтаксічны паралелізм, пабочныя словы і сказы), семантычных (адзінае семантычнае поле, парадак паслядоўнасці сказаў, падткст), рытмікамеладычных (даўжыня фразы, тэмп, гармонія, рытміка, эмфазы, інтанацыя), графічных (знакі прыпынку, чырвоны радок, розныя шрыфты), стылістычных (паўторы, мастацкія фігуры – антытэза, градацыя, паралелізм і інш.) і інш. Паняцце звязанасці арыентуецца на структурную арганізацыю тэксту. Структурная сувязь выражаецца логіка-інтанацыйнымі сродкамі і праз словы. Напрыклад:

*Усе рэкі Беларусі дужа прыгожыя. Дняпро з высокім правым берагам і неаглядымі далячынямі зарэчных паплавоў, паплямаваных дубамі і сінімі люстэркамі старыц. Прыпяць з яе празрыстай чыстай вадою, астравамі, пратокамі і шапкамі буслянак на прырэчных дрэвах. Дзвіна, сціснутая крутымі ўрвішчамі, зарослымі мачтавым лесам. Ласкавы Нёман, у воды якога глядзяцца старажытныя вежы і густыя лістоўныя пушчы. Нават невялічкая Шчара са сваімі шлюзамі ў цені неабхватных, серабрыстых таполяў. З раптоўным патокам вады, што вырываецца са шлюза і выносіць на сабе плыты з людзьмі, якія рухава і спрытна працуюць шастамі і бусакамі.* (У. Караткевіч)

У прыведзеным тэксце У. Караткевіча выяўляецца левабаковая сувязь з дапамогай слоў *Дняпро, Прыпяць, Дзвіна, Нёман, Шчара*, таму што гэтыя назоўнікі ў паслядоўных адзін за другім сказах адразу скіроўваюць увагу і суадносяцца з кантэкстам папярэдніх, а ўсе разам са словамі *усе рэкі Беларусі* першага сказа. Два апошнія сказы хутчэй спалучаны правабаковай сувяззю: у перадапошнім сказе слова *шлюзы* ўдакладняецца новай інфармацыяй апошняга парцэляванага сказа, дзе назіраецца паўтор гэтага слова.

Яшчэ адной прыкметай, ці катэгорыяй, тэксту выступае яго камунікацыйнасць, якая праяўляецца ў розных спосабах і сродках арыентацыі на інтарэсы камунікантаў.

Завершанасць як прыкмета тэксту не мае фармальных паказчыкаў, яна выяўляецца на аснове цэласнасці, унутранай звязанасці і характарызуецца прадметна-сэнсавай вычарпальнасцю ў адносінах да замыслу і рэалізуецца ў розных формах зачынаў і канцовак. Асаблівую ролю ў вызначэнні завершанасці тэксту адыгрывае загаловак, які, як сігнал, накіроўвае ўвагу чытача на праспектыўны выклад думкі і ставіць межы такому выкладу. Завершанасць – гэта ўласцівасць цэлага тэксту, а не яго часткі. Завершаным можна лічыць такі тэкст, калі асноўныя паняцці ў ім раскрыты, сувязі паміж імі яўныя.

Завершанасць тэксту складаюць такія яго паказчыкі, як тэматычнае адзінства, паслядоўнасць выкладу тэмы і яе раскрыццё, унутраная звязанасць і цэласнасць. Так, у тэксце Янкі Скрыгана чытаем:

*Прыназоўнік* ***для***. *Яго мы зрабілі надта універсальным. Пішам: ён сумленна жыў для навукі; цяпер вядома, для чаго ён збіраў лекавыя травы; не астаецца часу для заняткаў; яна стала для яго за маці; яна спявае для вас; для свайго часу гэта было прагрэсіўнай з'явай; я купіў для цябе кнігу; купіў бочку для капусты; для таго і стрэльба, каб з яе страляць; для яго гэта пацеха; для чаго гэта патрэбна. Усюды мы абыходзімся адным толькі* ***для***. *А давайце прыгледзімся, ці не лепш было б напісаць так, як патрабуе сама мова: цяпер вядома, навошта ён збіраў лекавыя травы; не астаецца часу на заняткі; яна стала мне за маці; яна спявае дзеля вас; на свой час гэта было прагрэсіўнай з'явай; я купіў табе кнігу; купіў бочку пад (або на) капусту; на тое і стрэльба, каб з яе страляць; усё робіцца дзеля карысці справы; яму гэта цяжка; навошта гэта патрэбна; каму гэта патрэбна. Вунь колькі прастору і лёгкасці стала ў гэтых фразах.*

Тэма гэтага тэксту – неправемернае злоўжыванне прыназоўніка *для.* Усе сказы тэксту цесна звязаны паміж сабой сэнсава, пра што сведчыць логіка выкладу: ад агульнага палажэння ў першым сказе, заўвагі аб непамернай пашыранасці ўжывання прыназоўніка *для* і ілюстрацыі яго шэрагам прыкладаў да палажэння аб магчымасці ўжывання іншых канструкцый і ілюстрацыі гэтага на прыкладах з выражэннем сваіх, аўтарскіх адносін у апошнім сказе.

Сказы ў тэксце паслядоўна ідуць адзін за другім паводле лінейнай сувязі, а сродкамі сувязі іх выступаюць: 1) займеннік *яго*, які ўжываецца ў другім сказе замест *прыназоўнік для* ў першым сказе; 2)

тэматычная сувязь ці прыналежнасць дзеясловаў *зрабілі, пішам,* калі трэці сказ раскрывае змест другога за кошт пераліку прыкладаў як пацвярджэнне аб *універсальным* прыназоўніку *для*; 3) прыслоўе *ўсюды*, якое ўводзіць у наступным сказе думку-заключэнне аб аднастайнасці ўжывання прыназоўніка, 4) паўтор словазлучэння *прыназоўнік для*; 5) супраціўны злучнік *а* ў новым сказе для дакладнага выражэння сувязі з папярэднім і далейшага пераліку ілюстрацый-правак; 6) указальны прыназоўнік *вунь* як вынік успрынятага ў папярэднім сказе і яго сувязі з новым сказам, які скіроўвае ўвагу на папярэднія прыклады.

Усё разам вызначае цэласнасць тэксту, які складаецца з уступнай часткі-тэзіса, ці палажэння, аб універсальным прыназоўніку *для*, асноўнай часткі – ілюстрацыя прыкладаў з нязменным ужываннем ва ўсіх прыкладах прыназоўніка *для*, затым закліку пабудаваць інакш прыведзеныя прыклады і ілюстрацыі змененых аўтарам выразаў, і заключэння, у якім аўтар выражае свае адносіны (*колькі прастору і лёгкасці .. у фразах*), тым самым падводзячы вынік сваім назіранням.

Такім чынам, <u>цэласнасць</u> як прыкмета тэксту вызначаецца адзінствам сэнсаў, закладзеных у мікратэмах, і звязаных агульнай тэмай (макратэмай) і выяўляецца ў камунікацыйнай пераемнасці элементаў, якія яго ўтвараюць. Гэта азначае неабходнасць выявіць гэтыя элементы цэлага, яго складнікі, альбо ўстанавіць, з якіх частак, адзінак складаецца тэкст, вырашыць пытанне аб члянімасці тэксту.

**1.1 Члянімасць тэксту** адбываецца на аснове розных паказчыкаў.

Паводле <u>змястоўна-лагічнага члянення</u> ў тэксце звычайна выдзяляюцца тры часткі – *уступ*, *галоўная частка* і *заключэнне*, з якіх у галоўнай частцы могуць быць выдзелены свае часткі ці адрэзкі тэксту.

*Уступ* звычайна ўводзіць у тэму, знаёміць з прадметам маўлення. Так, у навуковым выкладзе можа паведамляцца праблема, вызначаюцца задачы даследавання, абгрунтоўваюцца шляхі і спосабы, абраныя для вырашэння і інш. У публіцыстычных тэкстах на інфармацыйныя задачы накладаюцца задачы псіхалагічнага плана (зацікавіць, пераканаць і пад.), у сувязі з чым многія адзначаюць вялікую ролю пачатку тэксту.

*Галоўная частка* раскрывае асноўную тэму, намечаную ва ўступе. Менавіта ў гэтай частцы тэксту поўна раскрываецца тэма (*тэма* – гэта прадмет тэксту, гэта тое, аб чым гаворыцца ў ім, што апісваецца, пра што апавядае ці разважае аўтар), калі паведамляюцца

асноўныя звесткі ці сутнасць справы, апісваецца дзеянне, падзея ва ўсіх яе праявах, даецца ўсебаковае апісанне аб'екта, прыводзяцца аргументы на карысць пацвярджэння ці адмаўлення пэўнага палажэння, станоўчай ці адмоўнай ацэнкі яго і інш. Паўната раскрыцця тэмы забяспечваецца падборам падтэм, якія ўключаюцца аўтарам для адлюстравання і асэнсавання таго, пра што ён піша, а глыбіня залежыць ад таго, наколькі дэталёва аўтар раскрывае змест падтэм і тэмы ў цэлым паводле яго прагматычнай мэты выказвання.

*Заключэнне*, ці заключная частка, тэксту прысвечана падвядзенню выніку раней выкладзенаму, калі фармулiруюцца пэўныя вывады, падсумоўваецца апісанае, намячаюцца новыя задачы, якія патрэбна яшчэ вырашыць, выказваюцца адносіны да апісаных з'яў, падзей і інш.

Менавіта на трохчасткавым дзяленні заснавана школьная класічная схема функцыянальна-сэнсавых тыпаў маўлення – апавядання, апісання, разважання, кожная з якіх мае сваё напаўненне:

1) *апавяданне* – 1) пачатак дзеяння, 2) развіццё дзеяння і 3) заканчэнне. Напрыклад, тэкст-апавяданне:

*Ветлівы грыбнік*

*Жнівеньскім поўднем пайшоў я ў грыбы.*

*Іду павольна, пільна ўсё навокал аглядаю.*

*Убачу баравік ці падасінавік – капялюш надзену на галаву, каб руку вызваліць, і зрэжу грыбок. Укіну яго ў кошык і зноў здыму капялюш.*

*У гэты час збіраў грыбы адзін хлопчык з нашай вёскі. Ён ужо даўно хадзіў па лесе, а грыбы яму нешта не трапляліся.*

*Заўважыў малы, што я кожны грыб без капелюша сустракаю, і сам зняў сваю шапку.*

*Толькі ён гэта зрабіў, як убачыў каля сябе вялізны крамяны баравік. Хутчэй надзеў шапку на галаву і зрэзаў прыгажуна. Паклаў яго ў вядзерца і зноў шапку з галавы сцягнуў. Ступіў яшчэ некалькі крокаў і ўбачыў два чырвонагаловыя падасінавікі. А пасля, як на дзіва, пачалі яму грыбы трапляцца адзін за адным. Толькі паспявай паклоны адбіваць.*

*Хлопчык пасля падышоў да мяне і пытае:*

– *Чаму гэта грыбы тады трапляюцца, калі шапку знімеш?*

– *Таму, – кажу, – што грыбы ветлівых любяць.*

*Хлопчык засмяяўся, і мы, задаволеныя, разышліся ў розныя бакі.* (Паводле Р. Ігнаценкі);

2) *апісанне* – 1) сам прадмет, 2) яго дэталі і 3) адносіны ці ўражанне ад яго. Напрыклад, тэкст-апісанне:

*Возера Нарач*

*Нарач – самае вялікае возера Беларусі. Плошча яго – восемдзесят квадратных кіламетраў. Найбольшая глыбіня – пяцьдзесят метраў. Знаходзіцца яно на паўночным захадзе Мінскай вобласці.*

*Нарач адносіцца да азёр, якія не зарастаюць раслінамі. Вада ў гэтых азёрах чыстая, багатая на кіслярод. У іх адбываецца безупынны рух вады ад ветру і ад глыбінных плыняў. Дзякуючы гэтаму прыбярэжная паласа не ператвараецца ў балота і возера застаецца чыстае і адкрытае. Над Нараччу амаль заўсёды дзьмуць вятры.*

*На паўднёвым усходзе з возера выцякае рэчка Нарач, якую мясцовыя жыхары называюць Нарачанкай. Звілістай стужкай прабіраецца яна сярод топкага балота, якое зарасло хмызняком і чаротам, у раку Вілію, прыток Нёмана.*

*На поўначы бераг возера закругляецца, набываючы форму чашы, да краёў напоўненай вадой. З усходняга боку віецца паўз возера дарога, абапал якой высяцца сосны, расце ядловец. Справа – цягнецца цудоўны сухі і вясёлы сасновы бор. Злева – наступаюць на бераг хвалі.*

*На паўднёвым беразе лясоў няма. Да вады спускаюцца спадзістыя ўзгоркі. На іх расце толькі трава. Бераг нізкі, з зараснікамі трыснягу і чароту.*

*На ўсходзе возера Нарач злучаецца вузкім пралівам між пясчаных кос з возерам Мястра, плошча якога – трынаццаць квадратных кіламетраў. Непадалёку знаходзіцца возера Мядзель і маленькае возера Баторын.*

*Вось такое яно наша возера Нарач.* (Паводле В. Вольскага);

3) *разважанне* – 1) тэзіс, ці пастаноўка пытання, праблемы, 2) доказы і 3) вывад, ці заключэнне. Напрыклад, тэкст-разважанне:

*Лес – наша багацце*

*Амаль трэцюю частку тэрыторыі нашай рэспублікі займаюць лясы. А ўсяго два стагоддзі назад на лясы прыпадала больш чым палова ўсіх плошчаў. І ў гісторыі нашага народа, у яго штодзённым жыцці лес заўсёды адыгрываў вельмі значную ролю.*

*Па-першае, для нашых продкаў лес спрадвеку быў своеасаблівай кладоўкай. У лесе здабывалі дзічыну, збіралі мёд, ягады, арэхі, грыбы.*

*Па-другое, лес з'яўляўся найпершым будаўнічым матэрыялам. Гэта ж і цяпер больш чым на дзевяноста працэнтаў жылыя будоўлі ў нашых вёсках драўляныя, а яшчэ ў мінулым стагоддзі больш чым напалову былі драўляныя беларускія мястэчкі і гарады.*

*Па-трэцяе, лес, драўніна служылі матэрыялам для разнастайных хатніх рэчаў.*

*Нарэшце, лес – надзейнае сховішча для сваіх і непраходная перашкода для ворагаў.*

*Такім чынам, лес – гэта прыроднае багацце беларусаў, і ён патрабуе беражлівых адносін да сябе.* (Паводле Л. Пракопчыка)

Яшчэ адным відам чляненння тэксту выступае яго чляненне на абзацы як кампазіцыйна-стылістычныя адзінкі тэксту, паводле якога ў аснову бярэцца лагічнае адзінства як структурная адзінка тэксту. Тэрмін ‘абзац’ выкарыстоўваецца для абазначэння пэўнага адзінства сэнсу, структуры і пунктуацыі. Слова *абзац* абазначае і адступленне ў правы бок у пачатку першага радка (у гэтым значэнні выкарыстоўваецца яшчэ выраз *чырвоны радок*), і частку тэксту паміж такімі двума адступленнямі, ці выступае абазначэннем тыпаграфскай адзінкі. Тут размова ідзе пра слова ў яго другім значэнні – абзац як частка тэксту. У выніку абзац – гэта “пэўнае сінтаксіка-інтанацыйнае і кампазіцыйнае адзінства, якое складаецца з аднаго або некалькіх сказаў, аб’яднаных адной тэмай (прадметам выкладу)” [3, с. 20]. Заўважым, што ў дыялогу абзац не адыгрывае ролі сэнсавага выдзялення, тут абзац аддзяляе мову адной асобы ад мовы другой.

Выдзяленне абзацаў мае свае адметнасці адносна тэкстаў розных функцыянальных стыляў. У навуковых і афіцыйна-справавых тэкстах логіка выкладу ідзе ад асноўнай думкі да яе вытлумачэння ў дэталях, ад прычыны да выніку, ад сцвярджэння да доказу. Менавіта тут найбольш дакладна дзейнічае прынцып суаднесенасці лагічнага члянення тэксту і адпаведнага гэтаму вылучэння абзацаў. Напрыклад:

*Ужываючы слова* ***прыказка****, ледзь не заўсёды ставяць перад ім, усё роўна як пастаянны эпітэт у казках ці песнях, прыметнік народная. Калі пад ім разумець «створаная народам», дык ён у аднолькавай меры павінен бы далучацца і да ўсіх спрадвечна беларускіх слоў і фразеалагізмаў, бо і яны створаны народам. Традыцыйна лічаць прыказкі афарызмамі народнага паходжання, узніклымі непасрэдна ў жывой мове народа. Але гэта не заўсёды так. Ёсць нямала прыказак, якія прыйшлі ў нашу мову з іншых моў як запазычанні, калькі ці паўкалькі. Так,* ***Іван ківае на Пятра*** *– запазычанне з рускай мовы,* ***Рука руку мые*** *– калька з лацінскай мовы,* ***Хто плаціць грошы, той заказвае і музыку*** *– недакладная калька з англійскай мовы,* ***Добра смяецца той, хто смяецца апошні*** *– калька з французскай мовы.*

*Ёсць шэраг прыказак, якія паводле свайго першапачатковага ўжывання з'яўляюцца афарызмамі кніжнага паходжання, крылатымі выразамі, што адарваліся ад сваёй літаратурнай крыніцы і цяпер успрымаюцца як звычайныя прыказкі, фіксуюцца ў фальклорных зборніках або парэміяграфічных слоўніках – без паметы, хто стваральнік гэтага афарызма-прыказкі. Да прыкладу, 17 прыказак прыйшлі ў нашу мову з Бібліі:* ***Не хлебам адзіным жыве чалавек; Хто не працуе, той не есць*** *і г.д.*

*Шырока ўвайшоў у побыт крылаты выраз з байкі К. Крапівы «Сава, Асёл ды Сонца», ператварыўшыся ў звычайную прыказку* ***Каб сонца засланіць, вушэй асліных мала****. Яе ўжыванне ў сучасных літаратурных тэкстах пацвярджаецца ў «Слоўніку беларускіх прыказак» чатырма ілюстрацыямі.*

…

*Паўторым яшчэ раз: прыметнік-эпітэт народная пры слове прыказка лагічна не зусім апраўданы, хоць, несумненна, пераважная большасць прыказак, што ўжываецца ў сучасным беларускім маўленні, склалася ў жывой народнай мове і многія з іх маюць шматвяковую гісторыю.* (Паводле І.Я. Лепешава.)

У прыведзеным навуковым (навукова-вучэбным) тэксце беларускі даследчык парэміялогіі ў першым сказе першага абзаца заўважае пра не зусім правільнае і дакладнае ўжыванне словазлучэння *народная прыказка*, што і з'яўляецца агульным палажэннем. Далей аўтар паступова абгрунтоўвае яго прыватнымі выказваннямі і падмацоўвае канкрэтнымі фактамі, што дазволіла яму на аснове кампазіцыйна-лагічнага прынцыпу выдзеліць чатыры абзацы, з якіх у першым быў пачаты доказ на матэрыяле групы прыказак-запазычанняў з іншых моў. У другім абзацы прыводзіцца новы доказ, але на матэрыяле групы прыказак кніжнага паходжання і падмацоўваецца прыкладамі прыказак з Бібліі. Трэці абзац – яшчэ адзін аргумент пра канкрэтную літаратурную крыніцу – байку К. Крапівы – і адну прыказку з яе. І апошні абзац падводзіць вынік разважанням адносна меркавання, выказанага ў першым сказе тэксту, такім чынам звязваючы пачатак і заканчэнне.

У мастацкіх і публіцыстычных тэкстах выдзяленне абзацаў падпарадкавана яшчэ жаданню аўтара эмацыянальна або лагічна падкрэсліць, вылучыць тую ці іншую частку тэксту, а гэта спрыяе найбольш дакладнаму ўспрыманню аўтарскай думкі, выяўляе індывідуальнасць аўтара. Напрыклад:

*Нібы чакае дзедавых рук*

*Хвароба адпусціла ненадоўга. Зноў непрытомны дзед. Гарэў і кідаўся, ад некага адбіваўся. Так было яшчэ трое сутак. Тройчы ў непрытомнасці браў дудачку, пачынаў мелодыю, але хутка збіваўся з ладу, слабеў. Дудка заціхала…*

*Не стала дзеда…*

*Усёй сям'ёй мы зайшлі ў хату. Ён ляжаў, здавалася, нямёртвы. Такі ж спагадлівы, такі ж, здавалася, вясёлы, як бачылі, калі ён сустракаў унукаў ці пытаўся ў нас, суседніх, пра тое, ці назбіралі цяляткам травы, ці не ўкралі каты´ нашых кніжак…*

*З-пад падушкі глядзела на хату, на людзей далікатна абсмаленая дудка, нібы чакала яго – дзедавых – рук…* (Ф. Янкоўскі.)

У прыведзеным тэксце аўтар выдзяляе чатыры абзацы, з якіх другі, трэці і апошні вылучаюцца на аснове эмацыянальнага фактара, паколькі такі падзел тэксту найбольш выражае і рэалізуе яго эстэтычна-пазнавальную функцыю.

Пошукі адзіных крытэрыяў чляненне розных паводле стылістычнай прыналежнасці тэкстаў прывяло да чляненне тэксту <u>на аснове выдзялення </u>яшчэ адной мінімальнай адзінкі тэксту – <u>звышфразавага адзінства</u> (далей – ЗФА). Звышфразавае адзінства, ці складанае сінтаксічнае цэлае, як два найбольш пашыраныя тэрміны для абазначэння аднаго і таго ж паняцця (яшчэ ўжываюцца тэрміны «празаічная страфа», «кампанент тэксту») – два і больш сказы, якія складаюць структурна-семантычную адзінку тэксту, найменшую частку з сэнсавай цэласнасцю, у якой сказы значна больш цесна звязаны паміж сабой паводле лагічнай і сэнсавай звязанасці і завершанасці.

Найважнейшай прыкметай ЗФА выступае яго тэматычнае, ці сэнсавае, адзінства: усе сказы, якія зяўляюцца яго складнікамі, звязаны адзінствам зместу, развіваюць адну думку, складаюць адну мікратэму. У параўнанні са сказам ЗФА валодае большай сэнсавай закончанасцю і большай самастойнасцю. У ім найбольш выразна выяўляюцца функцыі паўтораў слоў, выкарыстання сінонімаў, займеннікаў, дзеясловаў і іх формаў, асабліва формаў часу, прыслоўяў, злучнікаў, ужывання няпоўных сказаў, розных тыпаў далучальных канструкцый, пабочных слоў і інш.

Важна і тое, што ЗФА і яго выдзяленне ў параўнанні з абзацам не залежыць ад стылістычнай прыналежнасці тэксту, аўтарскіх, ці суб'ектыўных, фактараў. Асновай выдзялення звышфразавых адзінстваў, іх пачатку і канца, выступае найперш сэнсавая цэласнасць і завершанасць часткі тэксту, якія выяўляюцца ў разнастайнасці тыпаў структуры і сродкаў сувязі.

Такім чынам, тэкст характарызуецца цэлым радам прыкмет, сукупнасцю пэўных законаў сваёй будовы, веданне і ўлік якіх дапамагае правільна ўспрымаць аўтарскія і будаваць уласныя тэксты, а для работы настаўніка – яшчэ і правільна арганізаваць вучэбную дзейнасць вучняў па развіцці маўлення.

## 2 ВЫКАРЫСТАННЕ ТЭКСТАЎ У НАВУЧАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Як піша А.Я. Міхневіч: "З мноства ўласцівасцей чалавека вылучаецца адна, найбольш істотная – валоданне мовай" [2, с. 175]. А таму задача школы ўвогуле і ўрокаў беларускай мовы ў прыватнасці – выхаванне новага чалавека, усебакова развітай асобы, выхаванне ў вучняў высокай культуры маўлення, без якой немагчыма ўявіць гарманічнага чалавека, які спалучае духоўнае багацце, маральную чысціню і фізічную дасканаласць.

Асноўнае месца ў навучанні мове ў такім разе павінны займаць пытанні семантыкі тэксту, сінтаксісу тэксту, стылістыкі тэксту, ці лінгвістыкі тэксту. Такі падыход да навучання беларускай мове ў школе стаў магчымым дзякуючы, па-першае, развіццю навукі аб мове, па-другое, патрэбам і заказу грамадства школе ўвогуле і навучанню мове (-ам) у прыватнасці.

Асноўным і зыходным палажэннем паводле матэрыялу для навучання беларускай мове з'яўляецца выкарыстанне тэкстаў як асноўнага дыдактычнага матэрыялу, калі на кожным уроку дэманструецца, аналізуецца тэкст на пэўную тэму з мэтай знаёмства з інфармацыяй тэксту, успрымання, асэнсавання і засваення яе, з мэтай выяўлення прыкмет тэксту (асноўных і паступова больш дэталёвых), яго тыпу паводле розных паказчыкаў, выяўлення адзінак мовы і іх дзеяння ў тэксце паводле пэўных законаў і правілаў функцыянавання як адзінак маўлення, іх сувязей з іншымі і ўтварэнне адзінага цэлага і інш. Такім чынам, тэкст на ўроках беларускай мовы выступае асноўным сродкам навучання, асноўным аб'ектам назірання і важным сродкам выхавання.

Тэксты з'яўляюцца сапраўднымі захавальнікамі культуры кожнага народа. Далучэнне навучэнцаў да культуры адбываецца шляхам прысваення ім "чужых" тэкстаў. Менавіта тэкст захоўвае інфармацыю пра гісторыю, этнаграфію, нацыянальную псіхалогію, нацыянальныя паводзіны, г. зн. пра ўсё, што складае змест культуры.

Тэкст на занятках па беларускай мове выкарыстоўваецца як матэрыял, крыніца для выяўлення і аналізу пэўных моўных адзінак паводле іх выкарыстання ў тэксце, іх ролі ў ім, але пры гэтым акцэнт змяшчаецца на выяўленне іх ролі ў тэксце. Разгледзім паасобныя

пытанні будовы тэкстаў ва ўзаемасувязі з вывучэннем розных раздзелаў школьнага курса беларускай мовы, у прыватнасці, асобных пытанняў.

**2.1 Праца над тэкстам і вывучэнне сінонімаў і антонімаў.** Як заўважана, дзеці ў вусным маўленні часцей за ўсё карыстаюцца лексічным паўторам для сувязі сказаў у звязаным маўленні. Каб не паўтараць недахопы, не варта згадваць "узоры" вучнёўскіх работ такога характару. Лепш для ілюстрацыі выкарыстаць, напрыклад, заўвагі Я. Скрыгана пра аднастайнасць выкарыстання аднаго толькі слова:

*"**Вырашыць**. Мы пішам прыблізна так: "Была вольная часіна, і я **вырашыў** схадзіць у тэатр", "Так расхвалілі гэтую кнігу, што я **вырашыў** пачытаць яе", "Я **вырашыў** купіць сабе новае паліто", "Цяжка быць непісьменным, і я **вырашыў** вучыцца", "Думаў я, думаў і **вырашыў** заняцца пчалаводствам", "Доўга не было вестак ад брата, і я **вырашыў** наведаць яго".*

*Нельга сказаць, каб гэта было няправільна. Сэнс перададзены. Але ж ці хапае гэтага? Ці не абакралі мы сябе, заспакоіўшыся толькі на сэнсе? А дзе ж каларыт мовы, дзе тыя адценні, якія кожнаму выпадку надаюць свой характар? Дзе ж багацце, якое так і пераліваецца ў жывой гаворцы? Ясна, што калі б гаварылі жывыя людзі, то яны не абышліся б толькі гэтым "вырашыць". Давайце падумаем, як бы мы маглі сказаць, хоць прыблізна".*

А затым прапанаваць вучням папрацаваць над падборам сінонімаў да слова *вырашыць* у кожным выпадку яго ўжывання, пасля чаго можна зверыць з тымі, якія прапануе пісьменнік:

"*Можа нават сказалі б і так: "Была вольная часіна, і я **надумаў** схадзіць у тэатр", "Так расхвалілі гэтую кнігу, што я **захацеў** пачытаць яе", "Я **сабраўся** купіць сабе новае паліто", "Цяжка быць непісьменным, і я **насмеліўся** пачаць вучыцца", "Думаў я, думаў і **намысліў** заняцца пчалярствам", "Доўга не было вестак ад брата, і я **намерыўся** з'ездзіць да яго".* (Я. Скрыган).

Вывучэнне сінонімаў варта весці ў русле як лексіка-семантычным (сінонімы як лексічныя адзінкі з адметным значэннем), так і ў русле структурна-семантычным, г. зн. выяўляць іх ролю як сродкаў сувязі сказаў у тэксце і выпрацоўваць навыкі такога

ўжывання сінонімаў, калі пэўны член з папярэдняга сказа выступае пэўным членам наступнага сказа, але ён ужо па-новаму названы, тым самым дэталізуючы, удакладняючы назву прадмета, асобы і пад. Для прыкладу можна прапанаваць верш "Хлебныя словы" Петруся Броўкі і выдзеліць у ім блізкія па значэнні словы, вызначыць ролю іх выкарыстання ў пэўных радках з улікам сэнсу і сродку тэкстаўтварэння:

*Я помню, на паству калі выпраўлялі,*
*Дык* ***лустачку хлеба*** *з сабою давалі.*
*Які ж ён быў смачны!*
*Як сёння прыпомню –*
*Збіраў беражліва і* ***крошкі*** *з далоні.*
*Я помню,*
*як з* ***хлебам*** *выходзілі з дому,*
*Каб серп і каса не прысталі ад стомы,*
*Я помню –*
*у кайстру* ***буханкі*** *складалі,*
*Калі навабранцаў у войска склікалі.*
*Я помню* ***хлеб горкі, з мякінай, з паловай****,*
*І сціплую* ***пайку*** *ў час грозны, вайсковы.*
*Я помню, як* ***крошцы*** *былі вельмі рады*
*Няшчасныя дзеці з пакут Ленінграда.*
*Калі ж я зняважаны* ***хлеб*** *дзе пабачу,*
*Дык вельмі балюча,*
*Я ледзьве не плачу.*
*Хто кінуў,*
*дык годнасць людскую ён страціў,*
*Абразіўшы гэтым зямлю, сваю маці.*
*Нанёс ёй, няўдзячны, глыбокую рану,*
*Я думаю, кім жа такі ўзгадаваны?!*

Работа над выпрацоўкай уменняў выкарыстоўваць сінонімы для сувязі сказаў у тэксце павінна весціся пастаянна, але пачынаць яе варта ў час вывучэння сінонімаў, тым самым асэнсоўваючы розныя тыпы сінонімаў і іх функцыянальную ролю ў маўленні. І ўсё ж спачатку варта засяродзіцца на семантычных сінонімах, якія найбольш лёгка ўспрымаюцца вучнямі. Для ілюстрацыі возьмем наступны тэкст, дзе выяўляюцца розныя словы для абазначэння аднаго і таго ж, ці дублеты:

*Міша і Грыша не толькі ўсімі лічыліся, але і сапраўды былі закадычнымі* ***сябрамі****.* ***Сяброўства*** *іхняе пачалося яшчэ з першага школьнага дня першага школьнага года. За шэсць школьных класаў адбылося нямала розных змен у іх характарах і росце, але ў шчырай, самаадданай* ***дружбе*** *іхняй нават самыя прыдзірлівыя крытыкі не заўважылі б ніякіх змен. І ўсе так прывыклі да гэтай* ***дружбы****, што цяпер цяжка было і ўявіць сабе Мішу без Грышы, а Грышу без Мішы. Можа, таму і празвалі іх адным здвоеным імем Міша-Грыша або Грыша-Міша, гледзячы па тым, да каго звярталіся.* (А. Якімовіч)

У тэксце відавочным выступае сэнсавая ланцуговая сувязь праз паўтор кораня слоў *сябар* і *сяброўства*, а затым праз выкарыстанне сінонімаў *сяброўства* і *дружба*. З вучнямі важна вызначыць, што аб’ядноўвае гэтыя словы іх лексічнае значэнне: *сяброўства* ‘адносіны паміж кім-небудзь, якія грунтуюцца на духоўнай блізкасці, агульнасці інтарэсаў, узаемнай прыхільнасці і пад.’ і *дружба* ‘блізкія прыязныя адносіны паміж кім-небудзь, заснаваныя на ўзаемнай прыхільнасці, агульнасці інтарэсаў і пад.; сяброўства’.

А вось тэкст для ілюстрацыі семантычных сінонімаў:

*Дарогі Палесся*

*Добрыя цяпер на Палессі дарогі. Ідуць па шашы нагружаныя машыны, спяшаюцца, вязуць лён, бульбу, гародніну, малако. Дзе і падзеліся сыпкія, пыльныя, пясчаныя гравійкі.* (Паводле А. Андруховіча)

Сказы ў тэксце звязаны сінонімамі. Пра іх пойдзе гутарка настаўніка з вучнямі:

– *Пра што паведамляецца ў тэксце?* (Пра дарогі Палесся)

– *Як яшчэ названы яны ў наступных сказах?*(Шаша, гравійка)

– *Чым адрозніваюцца гэтыя дарогі паводле сваёй назвы ад назоўніка* ***дарога****?* (*Шаша* – дарога, мошчаная шчэбнем, пакрытая асфальтам або іншым цвёрдым пакрыццём, прызначаная для руху бязрэйкавага транспарту; *гравійка* – дарога, насыпаная гравіем (асадкавай горнай пародай у форме акругленых дробных каменьчыкаў, звычайна з прымессю пяску і галькі).

– *Як называюцца такія словы, як* ***дарога, шаша, гравійка?*** (Сінонімамі).

– *Ці можна замяняць гэтыя словы ў тэксце адно другім без уліку значэння?* (Нельга)

– *Якімі словамі можам дапоўніць гэты сінанімічны рад?* (Шлях, аўтастрада, аўтамагістраль, тракт, гасцінец, бальшак...).

*– Цяпер, карыстаючыся слоўнікам, установім значэнне прыведзеных сінонімаў да слова* ***дарога****.*

– *Ёсць розніца ў тым, якім словам назваць дарогу?* (Ёсць).

*– А зараз прадоўжым тэкст, выкарыстоўваючы новыя сінонімы да слова дарога для апісання і параўнання дарог, якія былі раней і якімі яны сталі ў наш час.*

Для ўдакладнення семантыкі сінанімічных слоў з дамінантным словам *дарога* можна звярнуцца і да наступнага тэксту:

*Вёска была на ўзгорку, а лес – ніжэй. Да яго вяла селавая дарога з выбітаю каляінаю ў сухой гліне. Калі па гэтай дарозе доўга ісці, выйдзеш да шашы – шырокай, асфальтаванай. Усе з далёкіх дарог вяртаюцца ў вёску па гэтай вось дарозе. Яна бывае гразкаю вязною і ўвосень, белаю – зімою. Яна бывае і вось такою – сухою, з выбітымі каляінамі, як цяпер.* (Л. Арабей)

Размова будзе датычыць найперш сродкаў сувязі сказаў у тэксце, лексічнага паўтору лексемы *дарога* і выкарыстання ў ім сінанімічнага слова *шаша*:

- *Пра што прапанаваны тэкст?* (Пра дарогу, якая вядзе да вёскі).
- *Аб якой дарозе ідзе гутарка*? (Аб селавой).

– *Чым адрозніваецца селавая дарога ад шашы?* (Памерам і апрацоўкай, падрыхтоўкай для перамяшчэння па ёй: пра першую можна сказаць вузкая, бо паведамляецца, што шаша шырокая, дарога абазначае неўпарадкаваную, спецыяльна не апрацаваную палоску зямлі – *з выбітымі каляінамі, гразкаю, сухою*, а шаша – шырокая і спецыяльна апрацаваная, бо паведамляецца, што яна асфальтаваная).

– *Якое значэнне мае слова дарога ў спалучэнні са словам далёкіх?* (У кантэксце можна палічыць сінонімам да падарожжа, іншых месцаў).

У звязку з папярэднімі тэкстамі і ў сувязі з аналізам семантычных сінонімаў да слова *дарога*, а таксама з мэтай папярэдзіць памылкі пад уплывам рускай мовы адносна ўжывання слоў *шлях і дарога* можна падумаць разам з вучнямі над разважаннямі Янкі Скрыгана аб слове *дарога* ў пераносным значэнні:

*“****Шлях****. Мы пачалі карыстацца ім супроць законаў мовы. Пішам: “****добрага шляху*** *табе”, “****у добры шлях****”, “****пайшоў у шлях****”, “****у далейшы шлях****“. Гэтым мы навязваем мове сваю недасведчанасць у ёй і непісьменнасць. Справа ў тым, што ў беларускай мове разуменне “шлях” толькі канткрэтнае. Калі мы гаворым “шлях”, то нават*

*уяўляем сабе шырокую наезджаную дарогу. “Паедзеш палявою дарогаю, а там выедзеш на шлях”. Мы нават прывыклі бачыць такую дарогу з прысадамі, уяўляем, як далёка наперад забягае яе палатно. А ў адцягненае разуменне ў нас пераходзіць не* ***шлях****, а* ***дарога****. Кажуць: “****добрай дарогі****” або “****шчаслівай дарогі****”, “****пайшоў у дарогу****”, “****пусціўся ў дарогу****”, “****выбраў сабе дарогу****”. Якраз тое, што па-руску перадаецца словам “путь”. А мы літаральна гэта перакладаем, думаючы, што пішам па-беларуску. Бо нават формы такой – “****у добры*** *шлях”, “****у шчаслівы*** *шлях” – няма, а ёсць “****добрай*** *дарогі”, “****шчаслівай*** *дарогі”.* (Я. Скрыган).

Нярэдка сінанімічныя словы і выразы ў тэкстах мастацкай літаратуры выкарыстоўваюцца дыстантна ў ролі сродкаў сувязі, тэматычнай аднастайнасці твора. Для прыкладу праілюструем трыма першымі строфамі верша “Пад Новы год” Якуба Коласа:

*Ноч глухая, цьма,* ***завея****,*
*Не відаць і свету,*
*Толькі <u>снег</u> адзін бялее,*
*Ў шэрань лес адзеты.*

*Ні праезду, ні праходу,*
*<u>Белы пыл</u> у полі,*
*Як бы тут дарожак з роду*
*Не было ніколі.*

*Свішча, плача і галосіць,*
*Вые* ***завіруха****,*
*Хаты, гумны, ўсё заносіць*
*Гурбамі наглуха.*

У тэксце, тэма якога зімовая непагадзь, сродкамі сувязі сказаў выступаюць назоўнік *снег* і перыфраза *белы пух*, а таксама сінонімы-назоўнікі *завея* і *завіруха*. Акрамя таго сказы аб’яднаны адзінствам выражэння дзеясловаў-выказнікаў незакончанага трывання ў форме цяперашняга часу 3-яй асобы адзіночнага ліку.

Асабліва часта ў мастацкіх і публіцыстычных тэкстах выкарыстоўваюцца сінанімічныя дзеясловы, якія служаць і адным са сродкаў сувязі сказаў у іх. Таму варта звярнуцца да дакіх прыкладаў, як наступныя:

I. *Снег* ***ішоў*** *з самага ранку. Ён* ***сыпаў*** *і* ***сыпаў****, зацярушваючы ўсе дарогі і сцежкі. А чацвёртай гадзіне снег* ***паваліў*** *так густа, што ў кабінеце адразу пацямнела.* (В. Хомчанка)

II. *Узрадаваны поспехам, Серж* ***сказаў****:*

– *Я сёння хачу паехаць у школу на машыне.*

– *Не свавольнічай, ідзі так, як усе дзеці, –* ***мармытнуў*** *сабе пад нос бацька.*

– *Ай! На машыне! –* ***яўкнуў*** *Серж мацней яшчэ, як першы раз, і з радасцю ўбачыў, што бацька зноў заткнуў вушы.*

– *Ай, ехаць на машыне! –* ***запішчаў*** *ён другі раз.* (К. Чорны)

У кожным з прыведзеных тэкстаў вучні выяўляюць дзеясловы-сінонімы, іх сэнсавую блізкасць і стылістычную афарбоўку, іх ролю ў кожным як сродку выразнасці і дакладнасці, сродку сувязі сказаў у тэксце дзякуючы аднастайнасці трывання і формам часу.

Пасля асэнсавання семантычных сінонімаў як сродкаў сувязі сказаў можна перайсці да разгляду тэкстаў і аналізу ролі кантэкставых сінонімаў у іх, ці вобразна-выяўленчых сінонімаў як сродкаў сувязі сказаў у тэксце. Напрыклад, гэта можна праілюстраваць на матэрыяле наступнага тэксту:

*Шпачыная навука*

*Стары садавод стаў сведкам забаўнай гісторыі. Ён назіраў, як шпакі вучаць сваіх дзяцей. Гэта было тады, калі ў шпакоў паявіліся пяцёра жаўтаротых птушанят. Бацькі з раніцы да вечара насілі папераменна ў драўляны домік корм.*

*У хуткім часе надышла пара і малышам вылятаць на самастойны пошук ежы. Толькі адзін з іх застаўся ў наседжаным гняздзе, не робячы нават спробы яго пакінуць.*

*Некалькі дзён шпакі працягвалі як ні ў чым не бывала карміць дамаседа. Дарослым дапамагала юная змена. Але вось аднойчы раніцай ля шпакоўні сабралася ўся сям'я. Кожны трымаў у дзюбе якую-небудзь пажыву, але аддаваць яе не спяшаўся. Дражнячы апетыт гультая, яны пралятaлі зусім блізка ад яго і садзіліся побач на галінках яблыні. Голад выштурхнуў птушаня з гнязда. Калі ж яно села на галінку, усе астатнія спусціліся на зямлю. А там ужо птушаня само знайшло сабе снеданне.* (Часопіс “Родная прырода)

У размове настаўніка з вучнямі асноўная ўвага скіроўваецца на кантэкставыя сінонімы ў тэксце:

– *Аб якім выпадку ідзе размова ў тэксце?* (Аб вучобе шпакоў свайго малога птушаняці).

– *Як называюцца шпакі ў наступных сказах?* (Бацькі, шпакі, дарослыя)

– *Ці можна гэтыя словы лічыць сінонімамі да слова* ***шпакі****?* (Не зусім).

– *А што ж іх зближае?* (Сэнс, змест тэксту).

– *Як можна назваць іх?* (Тэкставымі, кантэкставымі сінонімамі).

– *А як у тэксце названы малыя шпакі?* (Дзеці, жаўтаротыя птушаняты, малышы, юная змена).

– *Як аўтар называе аднаго з іх?* (Дамасед, гультай).

– *Каго мы так назавем – чалавека ці птушаня*? (Чалавека).

– *Чаму ж так аўтар называе малога шпака*? (Таму што ён лянуецца вылятаць з гнязда).

– *Для чаго гэтыя ўсе словы выкарыстоўваюцца ў тэксце*? (Яны дапамагаюць пазбегнуць паўтораў і, характарызуючы птушаня, яго бацькоў і другіх птушанят, злучаюць сказы ў тэксце).

– *Як успрымаўся б тэкст без гэтых кантэкставых сінонімаў?* (Вучні агучваюць тэкст, паўтараючы словы *шпакі, птушаняты* ці *птушаня*).

– *Для чаго выкарыстаны тэкставыя сінонімы і ад чаго залежыць іх ужыванне ў тэксце?* (Вучні спрабуюць адказаць, пасля чаго настаўнік падагульняе, што, сапраўды, кантэкставыя сінонімы ўжываюцца для сувязі сказаў, іх ужыванне заснавана на аснове падабенства, прыпадабнення аднаго прадмета другому ў залежнасці ад тэмы, зместу тэксту, яго асноўнаму замыслу).

Вось яшчэ прыклады такіх тэкстаў для вызначэння тыпу і сродкаў сувязі сказаў:

I. *Папаўзлі па небе снегавыя хмары. Вось закружыўся ў паветры* ***белы лёгкі пушок*** *і нячутна лёг на зямлю. Усё часцей залёталі гэтыя* ***белыя халодныя зімовыя матылькі*** *і пасыпалаіся на зямлю. Хутка бялее зямля. Дзеці рады* ***першаму снегу****.* (Паводле Я. Коласа)

II. *На ўскрайку горада Жодзіна стаіць* ***манумент*** *у гонар беларускай маці.* ***Скульптурная кампазіцыя*** *паказвае маці, якая праводзіць на вайну сваіх пяцярых дзяцей. Яна з надзеяй глядзіць ім услед.*

III. *Рана вяртаецца* ***жаўрук*** *у наш край з выраю. Толькі адкрыецца першая прагаліна за вёскай, а* ***пяюн вясны*** *ўжо тут як тут.*

Пры аналізе мастацкіх тэкстаў важна падкрэсліць у сінонімах тое агульнае, што дазваляе іх ставіць у адзін рад з іншымі словамі і

выразамі, і тое адметнае, што дазваляе выразіць адносіны аўтара, перадаць па-мастацку, вобразна і так, як бачыць гэта аўтар. Тым самым для вучняў становіцца відавочным, яны вучацца, як выражаць свае адносіны пры апавяданні пра што-небудзь, перадаючы апісанне чаго-небудзь і пад.

Праца над сінонімамі, неаднаразова праведзеная на матэрыяле розных тэкстаў на розных этапах навучання мове, выпрацоўвае ў вучняў, з аднаго боку, свядомыя адносіны да выбару і ўжывання сінонімаў, з другога – навыкі выкарыстання рознага тыпу сінанімічнай сувязі сказаў у тэксце.

Радзей, але не менш эфектыўна выкарыстоўваюцца тэкстаўтваральныя магчымасці антонімаў, якія дазваляюць надаць выразнасць і дакладнасць маўленню, сцісласць і даходлівасць зместу выказвання. Вось як апісвае Я.Маўр сваіх герояў у аповесці “Палескія рабінзоны”:

*У такі час і трапілі сюды гэтыя два хлопцы. Яны былі аднагодкі і мелі разам гадоў трыццаць пяць. Але выгляд, а таксама і характары іх былі зусім адменныя. Мірон быў худы, цыбаты дзяцюк, з блакітнымі вачыма, доўгім птушыным носам і доўгімі светлымі валасамі. Віктар, наадварот, – прысадзісты, карчасты, чарнявы, з круглым пляскатым тварам.*

*Мірон быў больш разважлівы, спакойны хлопец, а Віктар – жвавы, імклівы. Яны заўжды спрачаліся паміж сабою, але былі найлепшымі сябрамі і жыць не маглі адзін без аднаго.* (Я. Маўр)

Словы-антонімы набываюць асаблівае гучанне і надзвычай выразна раскрываюць сваё значэнне, калі трапляюць у пэўны кантэкст, дзе сутыкаюцца паміж сабой. Вось прыклад паэтычнага тэксту з выкарыстаннем антонімаў як тэкстаўтваральных сродкаў:

*Мне разгадаць бы вечнасці сакрэт –*
*адмоўнай сіметрычнасці прычыну:*
*святло і цемра,*
*свет і антысвет,*
*хлусня і праўда часу,*
*плюс і мінус.*
*Паўторана, нібы люстраным шклом,*
*зусім наадварот палова свету:*
*усход і захад,*
*і дабро і зло,*
*нянавісць і любоў,*
*зіма і лета.*
*То сціхне, то ўзгарыцца ў галаве*

*сусветнага адзінства супярэчнасць,*
*але ў сабе шануе чалавек*
*святло,*
*дабро,*
*любоў*
*ды праўду*
*вечна.* (А. Русецкі)

Нярэдка антонімы выступаюць тэмай тэксту і асновай яго ўтварэння, як, напрыклад, верш Вячаслава Рагойшы:

*Першы – апошні*

*У спісе ты –*
*Першы.*
*А бэсціць пачаў*
*І родную мову,*
*І пожні –*
*То хто б ні хваліў цябе,*
*Што б ні казаў –*
*Апошні, браток, ты,*
*Апошні.*

Цікавую разнавіднасць сувязі сказаў у тэксце люструе наступны тэкст, дзе першы і другі сказы аб'яднаны сэнсам антанімічных слоў: у першым сказе пры прамым парадку слоў выказнік вынесены ў канец сказа, у другім – пры адваротным парадку выказнік вынесены ў пачатак, у выніку чаго такая сінтаксічная пабудова двух суседніх сказаў дазваляе выразіць іх сэнсавую сувязь, антанімічныя лексемы па-за кантэксту тут з'яўляюцца крайнімі кропкамі сінанімічнага рада слоў і адлюстроўваюць розныя, але паслядоўныя этапы ў жыцці героя, якія ідуць адзін за другім:

(1) *Дзяцінства* ***канчалася***. (2) ***Наступала*** *новае жыццё.* (3) *Шкада было кідаць вольную Загоршчыну, абшары паплавоў і лясоў, свіст качыных крыл...* (4) *Шкада было мяняць усё гэта на гарадскую цеснату, на гімназічную муштру і зубрэнне, на казённыя муры, на шэры снег у асеннім халодным горадзе.* (У. Караткевіч)

Антонімы шырока выкарыстоўваюцца ў мастацкіх і публіцыстычных тэкстах, у звычайнай гутарцы як сродак яркай ацэнкі і характарыстыкі розных прадметаў, з'яў, вобразаў. Напрыклад:

*Воблакі... Адкуль яны? Куды нясуцца?*

*Не наглядзецца на воблакі ў бязвоблачны дзень. Яны могуць* ***расці****, могуць* ***знікаць****, як дым.*

*У ветраны дзень часцей бываюць нізкія воблакі. Яны імчацца па небе на адной вышыні, як ганцы. Шпарка, без аглядкі, гуртам. Сонца між іх то* ***выгляне****, то* ***схаваецца****. А зірнеш угору, вышэй верхавіння дрэў, туды, дзе бягуць шпаркія воблакі, бягуць* ***здалёку*** *ці* ***зблізку****, і падумаеш: "Гэта жыццё імклівае бяжыць. Якое яно імклівае!.."*

*Воблакі бываюць* ***высокія*** *і* ***нізкія****,* ***рэдкія*** *і* ***суцэльныя****.*

*Адны прыносяць* ***яснасць, пагоду****, другія –* ***непагадзь і навальніцу****.* (І. Грамовіч)

Аналіз тэксту паводле выяўлення месца і ролі антонімаў, іх часцінамоўнага выражэння прыводзіць да вываду, што тут антонімы пранізваюць увесь тэкст, служаць яго ўтварэнню.

Для ілюстрацыі тэкстаўтваральнай ролі антонімаў вельмі добра выкарыстоўваць тэксты прыказак, гэтых унікальных тэкстаў вуснай народнай творчасці, многія з якіх пабудаваны на антаніміі, супрацьпастаўленні лексем пры наяўнасці ў іх агульнага значэння. Напрыклад: *Мір будуе, а вайна разбурае; Свая хатка – родная матка, а чужая – мачаха; Згодаю двор збудуеш, а нязгодаю – гатовае разбурыш; Лёгка пасварыцца, цяжка памірыцца; Плётку ў адно вуха ўпусці, а ў другое – выпусці* і інш.

Асабліва выразнае выкарыстанне ў мове мастацкіх твораў набываюць два асноўныя прыёмы, заснаваныя на антаніміі, – антытэза і аксюмаран як экспрэсіўныя сродкі маўлення. Вось для прыкладу ілюстрацыя выкарыстання антытэзы ў безыменным вершы Ніла Гілевіча:

*Ісціна, адвечная, як свет:*
*Шчасце ходзіць толькі ў пары з горам.*
*За надзеяй – боль зняверу ўслед,*
*За пашанай – прыніжэння сорам.*
*За святлом знаходкі – горыч страты,*
*За агнём любві – разлукі снег.*
*За абдымкамі – падножка здрады...*
*Ісціна, адвечная як свет.*

А ніжэй прыведзены публіцыстычны тэкст Якуба Коласа, які пабудаваны на аснове прыёму антытэзы, ці супрацьпастаўлення процілеглых паняццяў:

(1) ***У людской грамадзе*** *ёсць розныя людзі.* (2) ***<u>У ёй</u>*** *<u>ёсць</u> вялікія* ***таленты****.* (3) *Як ранішні золак, усходзяць* ***яны*** *над народам і асвятляюць яму дарогі ў заўтрашні дзень.* (4) *<u>У ёй ёсць</u> героі, гатовыя ўсё аддаць для народа, для Радзімы.* (5) ***Але ёсць у ёй*** *і расколы-адшчапенцы, ганьбуючыя свой народ.* (6) ***Ёсць у ёй*** *розны людскі бруд, шкурнікі і прадажнікі, іуды, гатовыя гандляваць і нажывацца на крыві народа.*

Вучні чытаюць тэкст (возьмем для аналізу апошні), даказваюць, што гэта тэкст, вызначаючы тэму – ёсць розныя людзі ў грамадстве, асноўную думку – як важна стаць сапраўдным чалавекам, ведаючы пра сутнасць адшчапенцаў, яго структуру: тэкст складаецца з шасці сказаў, віды сувязі, якой звязаны сказы ў межах тэксту: другі сказ з першым звязаны паводле мадэлі "акалічнасць – акалічнасць" (*у людской грамадзе – у ёй*) займеннікавай лінейнай сувяззю, трэці з другім паводле мадэлі "дзейнік – дзейнік" (*таленты – яны*) – займеннікавай лінейнай сувяззю, чацвёрты выразна дэманструе дыстантную паралельную сувязь з другім, што выяўляе падабенства будовы і асабліва адзінапачатак (*У ёй ёсць...*), пяты сказ зноў звязаны паралельнай сувяззю і з дапамогай супраціўнага злучніка *а*, які далучае новую думку, і шосты сказ з пятым – паралельнай сувяззю з адзінапачаткам (*Ёсць у ёй*), а паміж сабой пяты і шосты злучаны паўторам ў адваротным парадку адзінапачатку другога і трэцяга сказаў *ёсць у ёй* замест *у ёй ёсць* як акцэнтацыя ўвагі і падкрэсліванне блізкасці і адметнасці, але найперш супрацьпастаўленнем назоўнікаў (*таленты, героі* і *расколы-адшчапенцы, бруд, шкурнікі і прадажнікі, іуды*). Пачынаецца тэкст сказам-зачынам пра *розныя людзі*, які патрабуе далейшага тлумачэння, што і адлюстроўваецца ў наступных сказах, якія супрацьпастаўляюцца паміж сабой, раскрываючы сутнасць гэтых розных людзей грамадства.

**2.2 Месца і роля розных часцін мовы ў тэксце.** Розныя часціны мовы па-рознаму ўдзельнічаюць у стварэнні тэксту, выконваюць тэкстаўтваральную функцыю, забяспечваючы разгортванне тэмы, кампазіцыйную і сінтаксічную яго арганізацыю. Для большай выразнасці і ў сувязі з паслядоўнай падачай кожнай часціны мовы ў школьнай праграме курса беларускай мовы, а значыць і іх паслядоўнага вывучэння спынім увагу паасобку на вызначэнні месца і ролі кожнай часціны мовы, пачаўшы з самастойных часцін мовы.

Н а з о ў н і к як адна з самых колькасных самастойных часцін мовы беларускай мовы выступае і адной з асноўных паводле свайго

выкарыстання і ролі ў тэксце. Паколькі назоўнік з'яўляецца носьбітам значэння прадметнасці, то яго ўжыванне ў тэксце забяспечвае "паўнату адлюстравання ў маўленні носьбітаў мовы матэрыяльнага і духоўнага свету" [1, с. 87]. Галоўная тэкстаўтваральная роля назоўнікаў – забеспячэнне тэматычнага адзінства тэксту. Так, у тэксце тыпу апавядання назоўнікі, якія выконваюць сінтаксічную ролю дзейнікаў і дапаўненняў, называюць удзельнікаў, выканаўцаў дзеяння і непасрэдна звязаны з тэмай тэксту. Напрыклад:

*Нейкі белаваты **струмень**, нібы рака, перасек **хлопцам** дарогу і пачаў адносіць **човен** убок. **Мірон** упарта стаў з ім змагацца.*

*– Сцеражыся! – раптам крыкнуў **Віктар**.*

*На іх нёсся вялізны, рагаты **корч**. **Сутычка** была немінучай: праскочыць з такім нязграбным **чоўнам** было ўжо нельга.*

*– Кладзіся! – крыкнуў **Мірон** і сам прыціснуўся да дна. Потым працягнуў наперад **вясло**, упёрся ў **корч** і паступова пачаў паслабляць **руку**, каб зменшыць **штуршок**. **Корч** не стукнуўся аб **човен**, але затое яны сашчапіліся і далей паплылі ўжо абодва разам.* (Я. Маўр)

Менавіта назоўнікі адыгрываюць важную ролю для шырыні і паўнаты раскрыцця тэмы, што звязана і непасрэдна залежыць ад набору фактаў, рэалізацыя якіх непасрэдна звязана з абранымі назоўнікамі. Напрыклад:

*У Савосева суседа*
*Быў пярэсценькі **каток**,*
***Выхаванец** Паўла-дзеда,*
*Такі слаўны **пестунок**!*
***Нос** чарнявы,*
***Хвост** бялявы,*
*Задзірасценькі;*
***Кіпцік**-шчыпчык*
*Заграбасценькі;*
***Лапкі**-драпкі*
*Машастковыя,*
*А **шарсцінaчкі***
*Шаўковыя;*
***Губкі, зубкі***
*Адмысловыя;*
***Вусы**-русы*
*Патырчастыя;*
*Тая **спінка**,*

*Як націнка,*
*Выгінастая.*
***Вушкі**-слушкі*
*Не мыляюцца,*
***Вочкі** ў ночку*
*Запаляюцца.*
*Ну, такі **каток** харошы,*
*Як драпянка за тры грошы!* (Я. Колас)

Тэкст пачынаецца і заканчваецца сказамі, у якіх дзейнікам выступае назоўнік *каток*, а асноўная частка – гэта набор фактаў для ілюстрацыі, які каток і якія адносіны да яго. Але для ўяўлення пра катка, для тэматычнай аднастайнасці тэксту і яго развіцця аўтар задзейнічае амаль усе найбольш важныя часткі яго цела, ці саматызмы (параўн. грэч. *soma*, родны склон *somatos* – цела): *нос, хвост, кіпцік, лапкі, губкі, зубкі, вусы, спінка, вушкі, вочкі*, а таксама *шарсціначкі* ў больш шырокім ужыванні тэрміна саматызм. Варта заўважыць і аб выкарыстанні назоўнікаў у ролі недапасаваных азначэнняў тыпу *кіпцік-<u>шчыпчык</u>*, *вушкі-<u>слушкі</u>*, а таксама у параўнальным звароце *як націнка.* Дарэчы тут будзе звярнуць увагу на прыметнікі, асабліва ў прэдыкатнай функцыі – *чарнявы, бялявы, задзірасценькі, заграбасценькі, машастковыя, шаўковыя, адмысловыя, патырчастыя, выгінастая*, паколькі яны дазваляюць даць дакладнае апісанне, вобразна намаляваць катка, аргументаваць, што *"каток слаўны"*, што і падводзіць вынік заключны сказ-канцоўка: *"Ну, такі каток харошы!"*, г. зн. прыгожы, паколькі тэкст прысвечаны апісанню вонкавага выгляду катка.

А вось другі вершаваны тэкст Якуба Коласа:

*Зіма*

*Надышлі марозы,*
*Рэчкі закавалі,*
*Белыя бярозы*
*Шэранем убралі.*

*Замялі дарогі*
*Ветрыкі снягамі.*
*Лес, як дзед убогі*
*З доўгімі вусамі.*

*Апусціў галіны*
*І стаіць журботна,*

*Мяккая пярына*
*Вочы адбірае.*
*Белая раўніна –*
*Ні канца, ні краю.*

*Пад плёнкай белай*
*Травы і лісточкі.*
*Рэчка анямела,*
*Змоўклі ручаёчкі.*

*Амярцвелі лозы,*
*Чуць галлём хістаюць,*

*Зрэдку верхавіны* — *А ў палях марозы*
*Зашумяць маркотна.* — *Ды вятры гуляюць.*

Гэты тэкст складаецца з зачыну – першая страфа і канцоўкі – апошняя страфа, аб’яднаныя агульным дзейнікам-назоўнікам *марозы*, а асноўная частка ўключае шэраг назоўнікаў прадметнага і прасторавага значэння, якія складаюць кампазіцыйную аснову апісальнага тэксту з тыповым значэннем “прастора і яе характарыстыка па выніках дзеяння”. Дзякуючы назоўнікам разгортваецца тэкст, забяспечваецца яго звязанасць і цэласнасць, кампазіцыйная арганізацыя.

У тэкстах назоўнікі са значэннем канкрэтных прадметаў, назваў прасторы і яе частак складаюць кампазіцыйна-сінтаксічны каркас тэкстаў-апісанняў. Напрыклад:

*Нарачанская* ***зямля****.* ***Край азёр*** *і* ***пушчаў****, сцюдзёных* ***крыніц****,* ***край*** *песень і легенд.* ***Сярод лясоў****,* ***на краі балота*** *побач* ***з Нараччу****, стаіць сціплы* ***помнік*** *у выглядзе скрыжаваных* ***вінтовак****. А наўкола – векавыя* ***хвоі****, імшастыя* ***паляны****, беластволыя* ***бярозы****. Недалёка* ***пад шатамі*** *кучаравых* ***сосен*** *відаць тры* ***зямлянкі****. Гэта былая партызанская* ***база*** *брыгады імя Варашылава.* (Паводле І. Чыгіра)

У маўленні вучняў нярэдка адзначаецца паўтор уласных назоўнікаў, напрыклад, пры перадачы біяграфіі пісьменніка, пры аналізе яго твораў тыпу *Янка Купала..., Янка Купала...* і інш. Для папярэджання такіх памылак варта паказаць узоры, як лепш, як патрэбна, для чаго можна выкарыстаць ніжэй прыведзены тэкст (дарэчы будуць такія ўзоры і пры вывучэнні ўласных назоўнікаў):

*Вяртанне ў Вільню*

(I) (1) *Восень.* (2) *Вільня ў тумане.* (3) *Пасля Пецярбурга, адкуль прыехаў <u>Янка Купала</u> па заканчэнні агульнаадукацыйных курсаў Чарняева, знаёмы горад здаўся задуменным, сумным, нават трохі насцярожаным.*

(4) *<u>Іван Дамінікавіч</u> нетаропка ішоў па вузкіх вуліцах і завулках, прыязна пазіраў на людзей, што траплялiся насустрач.* (5) *Чулася разнамоўная гаворка: руская, беларуская, польская, літоўская, яўрэйская.*

(II) (1) *Усхваляваны сустрэчай з Вільняй, <u>Іван Дамінікавіч</u> непрыкметна дайшоў да Дамініканскай вуліцы, дзе ў сутарэнні дома № 13 змяшчалася кнігарня.* (2) *Сюды часта ішлі людзі, каб пазнаёміцца з навінкамі літаратуры.*

(3) *Некалькі хвілін* <u>*паэт*</u> *стаяў каля змрочнай быдыніны, збіраючыся з думкамі.* (4) *Калі ж спускаўся па прыступках уніз, у кнігарню,* <u>*яго*</u> *адразу заўважылі і сустрэлі сяброўскімі прывітаннямі.* (5) *Твар* <u>*яго*</u> *засвяціўся, шэра-блакітныя вочы праясніліся.* (6) *Так прыемна зноў сустрэцца з сябрамі.* (А. Есакоў)

Пасля прачытання ўстанаўліваецца, што гэты тэкст тыпу апавядання з ярка выражанай тэмай у загалоўку складаецца з дзвюх частак. Мікратэма першай, якая ахоплівае два абзацы, – вяртанне і сустрэча Купалы з Вільняй. Усе сказы ў ёй звязаны лінейнай сувяззю, а сродкамі сувязі выступаюць назоўнікі. Так, у зачыне першай часткі спачатку ўжываецца назоўнік *Вільня* для дакладнага абазначэння месца, куды прыехаў, дакладней, вярнуўся з Пецярбурга Янка Купала. Затым у наступным сказе ён замяняецца на агульны назоўнік *горад*, а псеўданім *Янка Купала* як найбольш пашыраны ва ўжыванні замяняецца ў наступным сказе на ўласнае двухкампанентнае імя *Іван Даміньквавіч.*

Мікратэма другой часткі – наведванне Купалам кнігарні і сустрэча сяброў. Тут у першым сказе-зачыне зноў узнаўляюцца ўласныя назоўнікі – *Вільня* і *Іван Дамінікавіч* як сродкі сувязі дзвюх частак. У межах часткі сказы звязаны лінейнай сувяззю: другі сказ звязаны з першым паводле мадэлі “дзейнік – акалічнасць” (*кнігарня – сюды*), трэці з другім – “акалічнасць – дапаўненне” (*сюды – будынінай*), чацвёрты з трэцім і пяты з чацвёртым – займеннікавай сувяззю паводле мадэляў “дзейнік – дапаўненне” (*паэт – яго*) і “дапаўненне – дапаўненне” (*яго – яго*). Звяртаецца ўвага на паслядоўнае ўжыванне ў другой частцы уласнага назоўніка *Іван Дамінікавіч*, затым назоўніка *паэт* і пасля займенніка *яго*.

Для навучання тэкстатворчай дзейнасці важна, з аднаго боку, паказаць тыя тыповыя памылкі і такім чынам папярэдзіць іх ужываннеі, а з другога – тое тыповае, што характарызуе ўжыванне гэтай часціны мовы як сродку сувязі, матываванае ў пэўных выпадках. Так, для аналізу прапануем тэкст творчай работы вучня:

***Мая школа*** *размешчана блізка ад майго дома.* ***Мая школа*** *вялікая і займае вялікі ўчастак.* ***Школа*** *агароджана прыгожым металічным плотам. Каля* ***школы*** *многа кветак. Мы любім і летам бываць у* ***школе****.*

Вучні вызначаюць, якой сувяззю – лінейнай ці паралельнай – звязаны сказы ў тэксце, які сродак сувязі, колькі разоў паўтараецца назоўнік *школа* ў ім для сувязі сказаў, і прыходзяць да вываду, што паўтор

слова *школа* псуе тэкст: робіць яго груватскім, цяжкім. Вучні спрабуюць яго выправіць.

Але важней на першым часе засяродзіць увагу вучняў і пазнаёміць іх з магчымымі выпадкамі паўтору назоўнікаў як сродкаў сувязі сказаў у тэкстах пэўных тыпаў і стыляў:

1. Так, у навуковых і афіцыйна-справавых тэкстах паўтор назоўнікаў абумоўлены ўжываннем тэрмінаў ці дакладных назваў. Напрыклад, паўтор назоўніка-тэрміна – зусім заканамерная з'ява для тэксту навуковага стылю, як у наступным выпадку, дзе тэрмін *сінтаксіс* як назва раздзела навукі аб мове паўтараецца, у тым ліку і ў складзе словазлучэнняў з ім – *эмпірычны сінтаксіс, тэарэтычны сінтаксіс*:

***Сінтаксіс*** *як навука працяглы час характарызаваўся, а ў значнай ступені працягвае характарызавацца, дыспрапорцыяй паміж нязмернай колькасцю прыватных назіранняў і даследаванняў і нешматлікасцю прац, прысвечаных асэнсаванню сабранага матэрыялу і шырокім абагульненням. Гэта колькаснае адрозненне можа быць інтэрпрэтавана як адрозненне паміж пераважна* ***эмпірычным сінтаксісам****, меўшым галоўным прадметам вывучэнне злучэнняў слоў (тыпы словазлучэнняў), і* ***сінтаксісам тэарэтычным****, асноўнай задачай якога з'яўляецца высвятленне заканамернасцей спалучальнасці слоў (заканамернасцей словаспалучальнасці). Проціпастаўленне* ***эмпірычнага сінтаксіса*** *і* ***сінтаксіса тэарэтычнага*** *адноснае, як, дарэчы, і любое іншае проціпастаўленне. Аднак на даным этапе яно, несумненна, карыснае, бо зусім ясна, што адно толькі далейшае накапленне прыватных назіранняў не прывядзе да рашучага паглыблення, а ў шэрагу выпадкаў і перагляду існуючых сінтаксічных уяўленняў. Навуковая індукцыя саступае месца дэдуктыўнаму падыходу, г.зн. гіпотэзам, наперадзе ў якіх – адстойваць свае правы ператварыцца ў сінтаксічную тэорыю. Зразумела таксама, што гэты новы этап у развіцці* ***сінтаксіса*** *не можа не абапірацца на выніхі, дасягнутыя* ***эмпірычным сінтаксісам****, мовазнаўствам у цэлым, а таксама на здабыткі некаторых навук, сумежных з мовазнаўствам.* (А. Міхневіч)

Навуковыя тэксты ўвогуле характарызуюцца ўжываннем назоўнікаў з абстрактным значэннем, пры гэтым ніякі род гэтых назоўнікаў пераважае, паколькі ён найбольш адцягнена-абагулены па сваім граматычным значэнні, напрыклад, аддзеяслоўныя назоўнікі на *-анне (-янне), -энне (-енне), -ка, -цыя, -цце* тыпу *ачыстка, дабаўленне, змешванне, ліццё, падрыхтоўка, прасейванне, растварэнне, фільтрацыя* і інш.

Такая катэгорыя назоўніка, як лік, мае свае адметнасці, што звязана з неабходнасцю абазначаць мноства праз адзін прадмет (*Мядзведка з'яўляецца шкоднікам сельскагаспадарчых культур*) ці абазначаць разнавідавыя прыкметы, названыя адным назоўнікам (*воды, кіслоты, лясы, солі*).

2. Паўтор назоўнікаў у тэкстах іншых стыляў проста неабходны пры наяўнасці некалькіх назоўнікаў аднаго роду, паколькі ў выніку іх замены на займеннікі цяжка зразумець, пра што ці пра каго ідзе размова. Так, у прыведзеным ніжэй тэксце, назоўнік *Нёман* паўтараецца ў першым ЗФА праз два сказы, а ў другім – праз адзін, паколькі ў папярэдніх сказах адзначаюцца назоўнікі ў той жа форме ліку і роду: у першым – *ручаёк, пачатак*, у другім – *летапіс*:

*Верхняе Панямонне*

(I) *На тэрыторыі Беларусі бярэ пачатак **Нёман**. На Уздзеншчыне, ля вёскі Забалоцце, бяжыць невялікі ручаёк. Гэта і ёсць пачатак ракі. Хоць гэта і ручаёк, але яго з пашанаю ўжо велічаюць іменем бацькі-**Нёмана**.*

(II) *З **Нёманам** звязана слаўная гісторыя не толькі беларускага краю і народа. Падзеі, што адбываліся на берагах гэтай ракі, уваходзяць у летапіс нашай Айчыны. Пра **Нёман** складзены легенды, песні, паданні. Ён апеты ў творах многіх класікаў і вядомых пісьменнікаў.* (Часопіс "Беларусь")

Пры аналізе гэтага тэксту звяртаецца ўвага не толькі на неабходнасць ужывання паўтору назоўніка *Нёман*, але і на сінтаксічную функцыю яго як сродку сувязі сказаў у тэксце і як сродку сувязі двух ЗФА (I; II).

3. Паўтор назоўнікаў абумоўлены і пры перарыве, укліненні паміж сказамі аб адным і там жа прадмеце гутаркі іншых сказаў, якія блізкія па сэнсе, але новыя паводле прадмета размовы, і тады ўзнікае неабходнасць узнавіць назоўнік. Напрыклад, у вершы "Песня мая" Янкі Купалы назоўнік *песня*, які пачынае тэкст, паўтарае праз кожныя дзве страфы, роўныя некалькім сказам, а ў выніку назоўнік *песня* з'яўляецца скрэпам усяго тэксту, своеасаблівым мосцікам развіцця думкі. Вось толькі першыя пяць строф:

***Песня** мая не ўзышла сярод кветак,*
*Кветак цвітучага вечна паўдня...*
*Поўначы сумнай забыты палетак*
*Даў ёй жыццё пасярод палына.*

*Пушча і ночка яе гадавалі,*
*Няньчылі казкамі доляй нямой;*
*Дождж і расіца вясною купалі,*
*Снежныя буры тулілі зімой.*

***Песня** мая не ўспінае атласаў,*
*Выдумкай хітрай у свет не ляціць, –*
*Знацца ёй досць з беларускаю красай –*
*Лесам шумеці, касою званіць.*

*З думкамі ходзіць забранага краю,*
*Служыць і верыць у лепшы усход...*
*Бо, калі гасне паходня старая, –*
*Новую заўтра распаліць народ.*

***Песні** маёй не патрэбны святліцы*
*Ў княжацкіх хорамах слухаць музык,*
*Коціцца-ўецца свабоднай крыніцай*
*К сонцу і зарам, прастор дзе вялік.*
*...*

Ва ўсіх выпадках паўтор назоўнікаў у тэксце падпарадкаваны стылістычным мэтам і задачам аўтара. Так, адзін назоўнік можа выступаць сродкам сінтаксічнай сувязі сказаў і апорным словам тэксту, таму яго паўтор у ЗФА абсалютна апраўданы. Для прыкладу возьмем наступны тэкст:

*У кожнага чалавека, які меў шчасце некалі нарадзіцца на нашай зялёнай – такой маленькай і такой неабдымнай – зямлі, абавязкова ёсць свой гожы, ласкавы і шчымліва-непаўторны **край**, які ў вялікім і шырокім паняцці Радзімы звычайна займае невялікае, звыклае месца. Такі **край** – заўсёды твой цэлы свет.*

*Ёсць такі **край** і ў мяне.* (Я. Сіпакоў)

У тэксце першы сказ – зачын, у якім выказваецца абагуленае ўяўленне пра свой для кожнага чалавека “гожы, ласкавы і шчымліва-непаўторны край” і ў якім асноўную сэнсавую нагрузку выконвае лексема *край.* Яна паўтараецца ў наступных двух сказах, выступаючы тым самым сродкам сінтаксічнай сувязі другога з першым сказам паводле мадэлі “дзейнік – дзейнік” і трэцяга з другім паводле зноў жа мадэлі “дзейнік – дзейнік”. Паўтор лексемы акцэнтуе ўвагу на сабе, узмацняе ўздзеянне сваім гучаннем і семантыкай – мясцовасць, што вылучаецца па пэўнай прыкмеце, у гэтым выпадку –

паводле месца нараджэння чалавека, становіцца ключавым словам усяго тэксту.

Для аналізу можна прапанаваць тэкст верша С. Грахоўскага, дзе ўжо з назвы пачынаецца адлік ужывання назоўніка (тэма верша) і яго паўтор як дамінанты ўсяго твора:

***Словы***

*Над намі* ***словы*** *уладарацъ.*
*Мы чуем і гаворым іх.*
***Яны*** *то здружаць, то пасвараць*
*Сяброў і ворагаў маіх.*
*Бо* ***словы*** *розныя бываюць.*
*Адны – агню стрымаюць шквал,*
*Другія* ***словы*** *забіваюць*
*Усё жывое напавал.*
***Ад слова*** *сэрца халадзее,*
*Праходзіць сон і забыццё,*
***Ад слова*** *рушацца надзеі,*
***Ад слова*** *свеціцца жыццё.*
***Ад слова*** *вырастаюць крылы,*
*І ў сэрцы стукае любоў,*
***Ад слова*** *прыбываюць сілы.*
*Дык не шкадуйце шчырых* ***слоў****!*

Для выпрацоўкі ўменняў выкарыстоўваць назоўнікі ў якасці сродкаў сувязі сказаў неабходна звяртацца да аналізу аўтарскіх тэкстаў з мэтай вучыцца, як можна, патрэбна гэта рабіць, а таксама складаць уласныя тэксты паводле ўзораў.

П р ы м е т н і к у залежнасці ад сінтаксічнай функцыі, пазіцыі ў сказе – прэдыкатнай ці атрыбутыўнай – па-рознаму ўдзельнічае ў стварэнні тэкстаў. Прэдыкатная пазіцыя – гэта рухавік апісання. Напрыклад:

*Яны былі вельмі непадобныя адзін на аднаго – беларус і латыш. Беларус – высокі, хударлявы, з выразнымі, вельмі пластычнымі рухамі, з непрыгожым тварам, які прыкрашвалі толькі глыбокія вочы пад цёмнымі бровамі. Латыш – ніжэйшы за яго, каржакаваты, з белым тварам і таўставатымі вуснамі. Вочы – блакітныя і вельмі ясныя. Валасы жоўтыя і мяккія, як лён, яўна пачыналі радзець. Выгляд надта сялянскі, але незвычайна добры і мілы.* (У. Караткевіч).

Атрыбутыўныя прыметнікі, якія ўжываюцца побач з назоўнікамі і падпарадкоўваюцца ім паводле сваёй формы, называюць самыя розныя прыкметы прадметаў і з'яў, якія назіраюцца, эмацыянальна ўспрымаюцца, і якія даюць ацэнку, інфармуюць. Менавіта таму такая асаблівая роля прыметнікаў-азначэнняў, прыметнікаў-эпітэтаў у тэкстах мастацкага апісання. Выразнасць прыметнікаў заснавана на тым, што яны служаць прыгожымі азначэннямі прадметаў, якія знаходзяцца ў стане спакою. Вось некалькі прыкладаў:

I. *Ну, пачнем мы казку так:*
*Жыў ды быў на свеце рак*
*З доўгімі вусішчамі,*
*З чорнымі вачышчамі,*
*Зыркімі, лупатымі,*
*З лапамі разгатымі,*
*Шырачэзны ў шыі,*
*Клешні – во якія!*
*А як вусам павядзе –*
*Страшна робіцца ў вадзе.* (Я. Колас)

II. *Найпрыгажэйшы бывае чалавек тады, калі ён не ведае пра гэта, калі ён не бачыць самога сябе. На жаль, нават часцей за ўсё тады, калі яго не бачыць ніхто.*

*Старога Вячэру ў лодцы бачыла цяпер толькі пяцігадовая Ганначка. Поўненькая, светленькая, любіміца сям'і, яна круцілася, як сініца, на сярэдняй лаўцы, перад сваім дзядулем, глядзела на яго, зусім не думаючы, што любуецца, і то сама шчабятала, то слухала, не бядуючы, што яшчэ няшмат разумее.*

*А дзед быў прыгожы.*

*Без шапкі, у шэрай, як ралля, расхрыстанай на сухіх, загарэлых грудзях кашулі. Упёршыся худымі і пругкімі, як смаляныя галіны, нагамі ў рабрыну вялікай лодкі, «кароль вугроў» паволі і няспынна разгойдваўся ўперад-назад, рытмічна ўзмахваючы цяжкімі вёсламі. З вельмі дакладнай і неабходнай для справы скупасцю заграбаў ён ціхую празрыстую ваду. Так лёгка і хораша, спраўна і спорна ідуць у пракосе сапраўдныя касцы. Белы маршчыністы лоб над загарэлымі скуламі шчодра акроплены потам. Сівыя валасы, хоць і прычасаныя перад ад'ездам у людзі, як толькі ён зняў кепку, зноў растрэсліся, прынялі свой звычайны, сціпла кучаравы беспарадак.*

*Прыгожая была гэта шэрая, вельмі жыццёвая, натуральная прастата, гэтая яшчэ ўсё не растрачаная сіла, якую і не высушылі, і не прыглушылі дзевяць дзесяткаў больш катаржных, чым радасных,*

*гадоў. Прыгожы быў позірк светла-блакітных вачэй пад густымі, сівымі брывамі, вачэй адкрытых і чыстых, як само бясхмарнае неба, паўторанае ў крынічным люстры бяскрайняга возера. Прыгожы быў, урэшце, увесь гэты звычайны, будзённы малюнак: вялікая чорная лодка на вадзяной пустыні, у лодцы – шэры дзед і светленькая ўнучка, а за кармой, на буксіры, – доўгае сасновае бервяно і яшчэ даўжэйшы трохкутнік растрывожанай вады.* (Я. Брыль)

У прыведзеных тэкстах варта звярнуць увагу яшчэ і на эмацыянальна-экспрэсіўную афарбоўку прыметнікаў, якую надаюць ім памяншальна-ласкальныя суфіксы (*поўненькая, светленькая*), пры апісанні ўнучкі дзеда побач з памяншальна-ласкальным яе іменем *Ганначка* ў другім тэксце, і, як у першым тэксце, павелічальна-ўзмацняльныя суфіксы (*шырачэзны, вусішчамі, вачышчамі*), што, з аднаго боку, з’яўляецца прыкметай тэкстаў мастацкай літаратуры, а з другога – з іх дапамогай нязмушана, у ходзе аповеду, апісання прадмета, з’явы, асобы выразіць адносіны аўтара да іх, даць ім ацэнку.

У навуковых тэкстах ужыванне прыметнікаў мае шэраг адметнасцяў, што абумоўлена характарыстыкай і сутнасцю самога стылю: вышэйшай ступенню абстрактнасці, абагульняльнасцю, дакладнасцю, адсутнасцю экспрэсіўнасці і эмацыянальнасці, паколькі мэта навуковых тэкстаў – паведаміць пра пэўныя факты, з’явы і аргументаваць, па магчымасці растлумачыць іх і пад. Таму прыметнікі тут вызначаюцца сваёй інфармацыйнасцю, выступаюць як сродак пераважна класіфікацыйны. Адметнасць ужывання прыметнікаў абумоўлена і тым, што яны ўваходзяць у склад устойлівых тэрміналагічных спалучэнняў. Дастаткова звярнуцца да наступнага тэксту энцыклапедычнага слоўніка, каб адзначыць спецыфіку выкарыстання прыметнікау у ім:

*Маланка, гіганцкі электрычны разрад у атмасферы, які звычайна праяўляецца яркай успышкай святла, што суправаджаецца громам. Найбольш часта ўзнікаюць у кучава-дажджавых воблаках; пры гэтым маланкі могуць праходзіць у саміх воблаках ці біць у зямлю (наземныя маланкі). Найбольш тыповыя лінейныя маланкі – шматразовы іскравы разрад з разгалінаваннямі, даўжыня ў сярэднім 1 – 10 км, дыяметр некалькі см, агульная працягласць парадку дзесятых доляў секунды. Звычайна маланка ўтрымлівае некалькі паўторных разрадаў, але іх лік можа даходзіць да некалькіх дзесяткаў; працягласць шматкратнай маланкі іншы раз перавышае 1 с. Такія маланкі, названыя зацяжнымі, часта выклікаюць пажары. Тэмпература канала пры галоўным разрадзе можа перавышаць 25000*

◦*С. Асобы характар маюць плоская і шаравая маланкі. Як лінейная, так і шаравая маланкі могуць суправаджацца моцнымі разбурэннямі, быць прычынай гібелі людзей.* (Геаграфічны энцыклапедычны слоўнік)

У тэксце, па-першае, звяртае на сябе ўвагу паўтор выкарыстання назоўніка-тэрміна *маланка*, што абсалютна заканамерна і характарызуе адну з адметнасцяў навуковых тэкстаў, пра якую ўжо адзначалася; па-другое, выкарыстанне прыметнікаў тыпу *зацяжная, лінейная, наземная, плоская, шаравая, шматкратная*, якія адлюстроўваюць навуковую класіфікацыю тыпаў маланкі як прыроднай з'явы. Тут жа адзначаюцца і адзін тып воблакаў – *кучава-дажджавыя*, якія ў навуковым апісанні могуць быць дапоўнены іншымі – *перыстыя, перыста-слаістыя, высока-слаістыя, высока-кучавыя, слаіста-дажджавыя, слаіста-кучавыя, слаістыя*, і іншыя тэрміны, у складзе якіх зафіксаваны прыметнікі, але ўсе яны не маюць экспрэсіўнага, ацэначнага значэння, якое характэрна пры іх выкарыстанні ў мастацкіх і шэрагу публіцыстычных тэкстах.

Як вядома, прыметнік (удакладнім: якасныя прыметнікі і некаторыя іншыя, што называюць значэнне якасці) вызначаецца наяўнасцю формаў ступеняў параўнання, якія ў беларускай мове характарызуюцца досыць значнымі стылістычнымі магчымасцямі. Так, простая форма прыметніка (зыходная) тыпу *вялікі, добры, моцны* нейтральная, а таму ўжываецца амаль ва ўсіх стылях як стылёва нейтральны сродак. Формы вышэйшай ступені параўнання з суфіксамі *-ейш (-эйш), -ш-* амаль не ўласцівы для мовы навуковых тэкстаў, а аналітычныя формы (складаныя) тыпу *больш высокі, менш гучны* вызначаюцца большай кніжнасцю і ўжывальнасцю ў навуковых тэкстах, як, напрыклад, у прыведзеным ніжэй тэксце, у якім можна назіраць ужыванне складанай формы вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў (*больш свабодны, больш выразны*) і іншыя адметнасці навуковых тэкстаў, у тым ліку паўтор назоўніка-тэрміна *аглютынатыўнасць* як сродку сувязі сказаў, класіфікацыйныя прыметнікі ў складзе навуковых тэрмінаў *словаўтваральная сістэма, вытворнага слова, марфалагічныя чаргаванні, прэфіксальны спосаб, словаўтваральная марфема* і інш.:

*Як найбольш агульную тэндэнцыю развіцця словаўтваральнай сістэмы беларускай мовы можна адзначыць рост <u>аглютынатыўнасці</u> ў будове вытворнага слова ў супрацьлегласць фузіі – зліццю марфем. <u>Аглютынатыўнасць</u> праяўляецца, у прыватнасці, у* ***больш свабодным*** *"складванні" марфем, г. зн. у паслабленні некаторых відаў марфалагічных чаргаванняў (параўн.*

*Волга – волжскі, шпага – шпажыст, але Лейпцыг – лейпцыгскі, штанга – штангіст), вычляненні такіх марфем, як -дром, -тэка і інш., актывізацыі прэфіксальнага спосабу дэрывацыі дзеясловаў і ў многіх іншых працэсах словаўтварэння. У выніку росту агглютынатыўнасці адбываецца* ***больш выразнае*** *расчляненне слоў на марфемы, звужаецца мнагазначнасць словаўтваральных марфем і тым самым павялічваецца колькасць такіх марфем, што характарызуецца адным і тым жа значэннем, строга вызначаным колам асноў, з якімі яны могуць спалучацца.* (Л. Шакун)

Як вядома, кароткія прыметнікі ўвогуле нехарактэрныя для беларускай літаратурнай мовы, за выключэннем прыналежных прыметнікаў у назоўным і вінавальным склонах пры неадушаўлёных назоўніках тыпу ***дзедаў*** *човен, рамантаваў* ***бацькаву*** *хату.* Аднак у мастацкай літаратуры, дакладней у паэтычных творах яе, ужываюцца кароткія і сцягнутыя формы адносных і якасных прыметнікаў, якія выступаюць у ролі выказнікаў, а іх ужыванне абумоўлена рытміка-арганізацыйнымі патрэбамі і асаблівасцямі вершаваных тэкстаў. Так, напрыклад, у паэме “Рыбакова хата” Якуба Коласа адзначаем такія выпадкі:

*Прашу – ўзыдзіце, калі ласка,*
*Ну хоць на гэты вось грудок.*
*Ёсць тут сем хвой. Не хвоі – казка.*
*Пад кожнай хвояй халадок.*
*Стаяць яны, ну, як графіні.*
*Я запалонен імі ўшчэнт,*
*І кожнай з іх, як той жанчыне,*
*Гатоў сказаць я камплімент.*
*Яны ўсе* ***стройны, свежы, крокхі,***
*Сваё ж аблічча ў кожнай з іх,*
*А прыгажэйшай з семярых*
*Назваць сапраўды не так лёгка.*

Да вывучэння з а й м е н н і к а ўжо павінны быць выпрацаваны паасобныя ўменні і навыкі ўжываць іх і вызначаць іх ролю ў тэксце як вынік сістэматычнай працы над аналізам тэкстаў: тэма тэксту, асноўная думка, тып сувязі – лінейная, паралельная, змешаная – сказаў у тэксце, сродкі сувязі сказаў і частак тэксту – паўтор лексем, ужыванне сінонімаў, замена займеннікам і інш.

Так, з улікам рэалізацыі камунікацыйнай накіраванасці навучання возьмем адно пытанне вывучэння марфемікі і

словаўтварэння, для чаго выкарыстоўваем тэксты з мэтай выяўлення слоў пэўнай будовы, а затым падрыхтоўкі новых тэкстаў, напрыклад, міні-тэкстаў навуковага стылю. Праілюструем толькі этап работы над адным словам, у складзе якога маецца прыстаўка.

Вучні ў прапанаваным тэксце вылучаюць і аналізуюць словы з прыстаўкамі, вызначаючы значэнне слова, падбіраючы аднакаранёвыя, даказваючы наяўнасць прыстаўкі. Возьмем для прыкладу прыметнік *бязвусы* ‘які характарызуецца адсутнасцю вусоў’, аднакаранёвыя – *вусы, вусаты, вусач.* Аналіз слова вядзецца планамерна паводле наступных пытанняў:

1. Дзе стаіць прыстаўка ў слове? [Прыстаўка *бяз-* стаіць перад коранем *вус*].

2. Што абазначае прыстаўка *бяз-* ? [Указвае на адсутнасць таго, што названа ўтваральнай асновай].

3. Якую ролю яна выконвае? [Служыць для ўтварэння новага слова: *вусы + бяз- = бязвусы*].

У адпаведнасці з адказамі вучняў на пастаўленыя пытанні настаўнік на дошцы паступова запісвае наступную схему:

I. Месца прыстаўкі ў слове.

II. Значэнне прыстаўкі.

III. Роля прыстаўкі.

Як працяг работы вучні складаюць тэкст міні-сачынення на тэму “Што я ведаю пра прыстаўку?” паводле запісанай схемы, якая адлюстроўвае класічную пабудову тэксту: зачын, асноўная частка і заключэнне. Часцей за ўсё вучні складаюць прыблізна такі тэкст:

*Прыстаўка бяз- у слове бязвусы стаіць перад коранем вус-. Прыстаўка бяз- абазначае адсутнасць таго, што названа утваральнай асновай -вус-. Прыстаўка бяз- служыць для ўтварэння прыметніка бязвусы ад асновы назоўніка вусы.*

Рэдагаванне тэксту скіравана найперш на вызначэнне структуры тэксту (тры часткі), сувязі сказаў у тэксце, а значыць на парадак слоў і выкарыстанне займенніка *яна*. Устанаўліваецца, ці добра выкарыстаць займеннік у першым сказе, чаму можна яго выкарыстаць у другім і чаму лепш паўтарыць назоўнік у трэцім, а ў выніку прапануецца запісаць адрэдагаваны тэкст прыблізна ў наступным варыянце:

*У слове бязвусы прыстаўка бяз- стаіць перад коранем -вус-. Яна абазначае адсутнасць таго, што названа утваральнай асновай -вус-. Прыстаўка бяз- служыць для ўтварэння новага слова – прыметніка бязвусы ад асновы назоўніка вусы.*

Працу над тэкстам пры вывучэнні займенніка і яго разрадаў неабходна падпарадкаваць руслу выпрацоўкі нормаў ужывання іх у тэксце, падкрэслівання іх ролі і, у прыватнасці, найбольшай каштоўнасці асабовых займеннікаў 3-яй асобы (*ён, яна, яно, яны* і іх склонавых формаў), якія выконваюць указальную функцыю, а таксама асобных указальных, азначальных і адмоўных займеннікаў, якія выступаюць сродкамі сувязі ў тэкстах.

Варта таксама падкрэсліваць адметнасць выкарыстання займеннікаў у навуковых тэкстах. Так, напрыклад, паведамляецца ці звяртаецца ўвагу пры аналізе навуковых тэкстаў, што займеннік *я* не выкарыстоўваецца ў іх, ён апускаецца або замяняецца займеннікам *мы*, так званае “аўтарскае мы” або “мы сціпласці”. Асабовыя займеннікі *ён, яна, яно, яны, мы* пры дзеясловах-выказніках выкарыстоўваюцца з адцягнена-абагуленым значэннем.

Увогуле важнейшай задачай вывучэння займеннікаў з’яўляецца іх выкарыстанне ў маўленчай практыцы вучняў. Таму важна пазбегнуць тыповых і найбольш пашыраных памылак пры ўжыванні займеннікаў, да якіх можна аднесці наступныя:

1) ужыванне займенніка пасля дзейніка і перад, як правіла, іменнай часткай выказніка тыпу *Янка Купала* ***ён*** *вялікі пясняр Беларусі*;

2) паўтор аднаго і таго ж займенніка ў складзе аднаго і таго ж сказа тыпу *Калі* ***ён*** *выйшаў на луг,* ***ён*** *здзівіўся прыгажосці красак*;

3) няправільная замена зборных назоўнікаў неадпаведным ім займеннікам тыпу ***Настаўніцтва*** *сабралася на свой сход, дзе* ***яны*** *абмяркоўвалі пытанні жыцця сучаснай* школы;

4) двухсэнсоўнасць, якая ўзнікае ў выніку няправільнага выкарыстання займенніка для замены назоўніка ці назоўнікаў, якія выкарыстоўваюцца перад ім тыпу ***Дзядзька Марцін і Андрэй*** *пабралі* ***косы і бабкі*** *на луг, дзе* ***яны*** *былі патрэбныя* (тут займеннік *яны* – хто ці што?).

Пры вывучэнні разрадаў займеннікаў неабходна звяртаць увагу вучняў на выкарыстанне ветлівых формаў асабовых займеннікаў *ты* (Вы) – *твой* (Ваш), *я – мы*, прыналежных займеннікаў *мой – наш, твой – ваш*, звяртаць увагу і правіць нявётлівае ўжыванне асабовых займеннікаў *ён, яна, яно, яны* ў прысутнасці асобы, аб якой ідзе гаворка, ці ўказальных займеннікаў *гэта, той* адносна асоб, якія прысутнічаюць пры размове ці могуць чуць яе.

Менавіта функцыянальны аспект вывучэння займеннікаў калі не вымушае, то патрабуе знаёмства з усімі разрадамі і асабліва названымі вышэй на сінтаксічнай аснове. Аднак у сувязі з перавагай выкарыстання тэкстаў як асноўнага дыдактычнага матэрыялу на

занятках беларускай мовы і ў адпаведнасці з адной з ліку важных задач навучання – умець карыстацца ўсімі адзінкамі мовы – сінтаксічная роля займенніка вызначаецца не толькі як члена сказа, словазлучэння, але і як сродку сувязі сказаў у ЗФА і ЗФА паміж сабою.

Напрыклад, возьмем тэкст з “Лясных казак” А. Каўко:

(1) *Гэты Дуб вельмі стары.* (2) ***Ён*** *і сам не ведае, колькі яму гадоў, можа, дзвесце, а можа, і ўсе трыста.* (3) *А колькі ж* ***яму*** *давялося перажыць.* (4) *З* ***яго*** *зрывалі лістоту буйныя вятры, па* ***ім*** *пляжылі маланкі, у* ***яго*** *траплялі кулі,* ***яго*** *цела дзяўблі асколкі снарадаў.* (5) *І хоць зялёная чупрына з часам парадзела, Дуб яшчэ моцна трымаецца каранямі за родную зямлю.*

У тэксце пяць сказаў, аб’яднаных у адно цэлае адной тэмай – моц дуба нягледзячы на ўзрост і беды. Добра пасля прачытання тэксту даць загаловак (“Дуб-асілак”, “Стары дуб”, “Моцны дуб”...), які аб’яднаў бы ўсе сказы.

Мэта аналізу тэксту паводле будовы, віду сувязі сказаў і яе сродкаў – устанавіць, што тэкст з лінейнай сувяззю сказаў, калі кожны наступны сказ развівае думку папярэдняга (1 – стары, 2 – многа гадоў, 3 – многа перажыць, 4 – што іменна, 5 – але трымаецца). Першы і апошні сказы – адпаведна зачын і канцоўка – аб’яднаны дыстантным паўторам слова *Дуб*. Другі сказ выяўляе сэнсавую сувязь і сінтаксічную з першым паводле мадэлі “дзейнік – дзейнік” з заменай назоўніка на займеннік (*Дуб – ён*), трэці сказ з другім – паводле мадэлі “дзейнік – дапаўненне” (*ён – яму*), чацвёрты з трэцім – паводле мадэлі “дапаўненне – дапаўненне” (*яму – па ім / у яго / яго*).

Галоўнае ў рабоце вучняў над тэкстам – зразумець, што дзякуючы займеннікам усе сказы звязаны адзін з другім лінейнай сувяззю з дапамогай галоўных і даданых членаў. Варта звярнуць увагу і на дзеяслоўную сувязь сказаў у тэксце: у пачатку і ў канцы тэксту – дзеясловы абвеснага ладу цяперашняга часу для перадачы адначасовасці існавання дуба і апавядальніка пра яго (*ведае, трымаецца*), а астатнія сказы ілюструюць ужыванне дзеясловаў абвеснага ладу прошлага часу для перадачы дзеянняў, якія адбываліся ў мінулым (*давялося перажыць, зрывалі, пляжылі, траплялі, дзяўблі, парадзела*).

Пры рабоце над тэкстам вартам звяртаць увагу на аб’ём інфармацыі, якую замяшчае займеннік пры выкананні сваёй ролі як сродку сувязі сказаў і частак тэксту, тым самым паказваючы ролю займеннікаў як сродкаў эканоміі маўлення. Вось першы тэкст:

(1) *Эх,* ***зямля****!* (2) *Колькі думак людскіх нячутнымі крокамі прайшло* ***па табе****, звіваючы* ***цябе*** *вяночкамі надзей і ружова-светлых*

*мар аб шчасці, аб куску надзённага хлеба!* (3) *Колькі нерасчытаных слоў шапацеў* ***табе*** *вецер шолахам збожжа, красак і травы на ўзмежках!* (4) *Колькі неразгаданых песень жыцця нераспевана* ***табе*** *за доўгія часы і гэтым сонцам, і гэтымі хмаркамі, і гэтым гоманам дажджоў, навальніц, і халодным смехам бялюсенькіх сцяжынак!* (5) *Колькі тканін выткалі* ***на табе*** *сялянскія сохі і бароны, каб аздобіць* ***цябе****, і ў адплату за гэта ўзяць* ***ад цябе*** *падатак хлебам!* (6) *Многа на 'пнісаў ляжыць* ***на табе****, а* ***ты*** *ўсё чакаеш, калі будзе паложан* ***на тваім*** *улонні такі напіс, што зробіць канец калатні з-за дароў* ***тваіх****?* (7) *І хто паложыць яго?* (8) *Адказ адзін: скасаванне ўласнасці.* (Я. Колас)

У тэксце з выразнай паралельнай сувяззю ад другога (пасля сказа-зачыну толькі з рэмай) па пяты сказ у асноўнай частцы усе займеннікі выяўляюць сувязь з назоўнікам *зямля* першага назыўнога сказа-зачына, г. зн. замена адбываецца на ўзроўні слова.

А вось другі прыклад:

(1) *У нас каля студні стаяла <u>высокая, лапушыстая **ліпа**</u>.* (2) *Сваёю зялёнаю кронаю* ***яна*** *прыкрывала студню ад пылу, ад смецця, якое часамі ўздымалі віхры на двары.* (3) ***Яна*** *засланяла ад буры і марозу і тыя чатыры яблыні, дзве грушы, якія стаялі за тынам.* (А. Бялевіч)

Гэты тэкст складаецца з трох сказаў, дзе першы сказ прадвызначае структуру другога і трэцяга, якія звязаны паміж сабой паралельнай сувяззю, а з першым сказам – займеннікавай сувяззю, але займеннік *яна* паводле зместу першага сказа замяняе назоўнік *ліпа* разам з яго азначэннямі, ці замяняе словазлучэнне.

Такія ж сувязі займенніка з назоўнікам, які ён замяняе, назіраюцца і ў наступным прыкладзе:

(1) <u>*Векавыя* ***дубы***</u> *стаяць паважныя, спакойныя ў сваёй велічы.* (2) ***Яны*** *не то што падпарадкоўваюцца агульным законам восені,* ***яны*** *проста, адчуваючы сваю сілу і моц, скараюцца ёй у апошнюю чаргу.* (3) *Подых восені мала яшчэ крануў* ***іх***. (4) *Рэдкія лісты зрываліся з галін* ***асілкаў*** *і ляцелі ўніз павольна, асцярожна.* (І. Шамякін).

У прыведзеным тэкставым фрагменце другі сказ з першым, трэці з другім звязаны лінейнай займеннікавай сувяззю паводле мадэляў “дзейнік – дзейнік” і “дзейнік – дапаўненне”, але пры гэтым абагульнена-прадметны займеннік *яны* (*іх*) выкарыстаны замест спалучэння прыметніка з назоўнікам *векавыя дубы*.

Але маюцца і іншыя адносіны, для чаго возьмем наступны тэкст:

(1) <u>*Суслы – людзі заможныя*</u>. (2) ***У іх*** *і крупадзёрка ёсць, і гаспадарка моцная, і хата добрая, прасторная.* (3) *Можа з гэтае прычыны чорнабароды Кандрат разумным чалавекам тут лічыцца.* (4) ***Ён*** *нават дазваляе сабе і аблаяць каго, і павучыць, і дараду даць, але толькі не хлеба...* (Я. Колас)

У гэтым тэксце другі сказ з першым і чацвёрты з трэцім зноў звязаны лінейнай займеннікавай сувяззю, але ў першым выпадку займеннік *іх* у другім сказе замяняе паводле інфармацыі ўвесь змест першага сказа, а ў другім – займеннік *ён* фармальна замяняе атрыбутыўнае словазлучэнне *чорнабароды Кандрат*, але на самой справе ён замяшчае паводле інфармацыі ўсю папярэднюю частку тэксту, такім чынам служачы эканоміі моўных сродкаў.

Пасля вызначэння ролі займеннікаў як сродкаў сувязі двух і больш суседніх сказаў, частак складаных тэкстаў акцэнтуецца ўвага на прыкладах тэкстаў, у якіх займеннікі выступаюць сродкам сувязі дзвюх частак тэксту, замяняючы цэлую групу сказаў. Напрыклад:

*Піла, якая не пілуе*

*Мы наслухаліся і начыталіся аб драпежнай рыбе-піле, якая распілоўвае драўляныя караблі, пускае на пілавінне шлюпкі і платы. Так, рыба, што носіць за сабой пілу, існуе. Завуць яе піларыл. Часам яна дасягае пяці метраў і вага яе перавышае трыста кілаграмаў. Але нікога і нічога сваёй пілой яна не распілоўвае, а здабывае з донных адкладаў сабе ежу.*

***І гэтая рыба*** *таксама з пілой. Называецца піланос. Жыве ў Індыйскім і Ціхім акіянах. Расказваюць, сведкі заўсёды ўсё ведаюць, што піланос урываецца ў касяк рыбы і пачынае “працаваць” у ім сваім жудасным інструментам. Толькі не зусім гэта так, сцвярджаюць навукоўцы. Піла ў піланоса – гэта як лапата ў рыбака, якой ён выкопвае з глебы чарвякоў. А рыба пілой дастае з пяску беспазваночных. Не прапусціць яна і дробных рыб.*

*Вось* ***такія яны*** *рыбы з піламі.* (З часопіса “Родная прырода”)

Прыведзены тэкст пра рыб з піламі (яго тэма) складаецца з дзвюх частак і трох абзацаў. Паколькі маюцца дзве мікратэмы: 1) пра рыбу піларыл і 2) пра рыбу піланос, выдзелены першыя два абзацы, якія адпавядаюць двум ЗФА. Яны паміж сабой звязаны ўказальным займеннікам *гэтая* (*рыба*) з прэпазіцыйным злучнікам *і*, дзе займеннік

паказвае на яшчэ адзін вядомы навуцы від рыбы з пілой. Заключны сказ-канцоўка тэксту падводзіць вынік усяму зместу і злучаны з двума папярэднімі абзацамі спалучэннем указальнага займенніка з асабовым у форме множнага ліку (*такія яны*) з указальнай часціцай *вось*, першы з якіх удакладняе прыкмету рыб, другі – аб’ядноўвае і падкрэслівае ўказальнае значэнне.

Для выпрацоўкі ўменняў складаць новыя тэксты неабходна найперш давесці выпадкі, калі нельга ўжываць займеннікі ў тэксце:

1) нельга замяняць назоўнік займеннікам, калі ў папярэдніх сказах выкарыстоўваюцца назоўнікі аднаго і таго ж роду і ліку;

2) нельга выкарыстоўваць займеннік, калі ён стаіць далёка ад таго слова, якое замяняе, таму час ад часу займеннік чаргуецца з паўназначным словам;

3) нельга ўжываць займеннік у навуковых тэкстах замест дакладных тэрмінаў.

Як варыянт работы настаўніка з вучнямі і з улікам развіцця творчай актыўнасці вучняў можна прапанаваць вучням самастойна, выкарыстаўшы адпаведныя правілы ўжывання паўтору назоўнікаў, на іх аснове вывесці адваротныя правілы, калі нельга выкарыстоўваць займеннікі.

З улікам пералічаных вышэй правілаў можна правесці аналіз ніжэй прыведзеных тэкстаў:

(1) ***Максім*** *старанна аглядаў сляды нядаўняй пакражы ў яго абходзе.* (2) *Высокі, упалавіну чалавека, дубовы <u>пень</u> ясна вылучаўся сярод дзеравяк і свяціў сваім светла-жоўтым <u>верхам</u> і свежымі трэскамі вакол, а шырокая, разложная верхавіна і адсечаныя сукі пазіралі так нявесяла, так сумна, бы тыя пакінутыя бацькамі дзеці.* (3) ***Максім*** *угледзеў маладую бярэзіну з абламанымі галінкамі.* (4) *Гэта дуб, звалены бязлітасным тапаром, падаючы, чапіў яе сваімі моцнымі сукамі.* (Я. Колас)

У тэксце пісьменнік двойчы, але дыстантна паўтарае ўласны назоўнік *Максім*, не замяняючы яго ў другім выпадку на займеннік, паколькі ў другім сказе ўжыта некалькі назоўнікаў мужчынскага роду, як і назоўнік Максім, – *пень, верх*. Паўтор назоўніка можна растлумачыць і тым, што паміж першым і трэцім сказам уклініўся складаны сказ, а значыць займеннік стаяў бы далёка ад назоўніка Максім, і гэта выклікала б непаразуменне.

Нярэдка займеннікі ў тэксце выступаюць у ролі антанімічных слоў і з’яўляюцца стрыжнем пабудовы тэксту, як, напрыклад, у наступным безыменным вершы Максіма Танка, дзе выкарыстаны

займеннік я і ты ў форме давальнага склону *мне* і *табе* і адзін раз у форме роднага – *цябе*:

*Хто размеркаваў так на свеце*
*І крыўдна, і несправядліва,*
*Аддаўшы табе дні святочныя,*
*А мне – клапатлівыя буднія.*
*Табе – ўсе пацехі і радасці,*
*А мне – ўсе згрызоты і рэўнасці,*
*Табе – ўсе праявы і прысуды,*
*А мне – марныя апеляцыі,*
*Цябе – надзяліўшы загадкамі,*
*Мне – толькі адгадкі пакінуўшы.*

Такім чынам, кожны раз, працуючы з вучнямі над гатовымі тэкстамі для аналізу і новымі, другаснымі ці першаснымі, уласнымі тэкстамі, звяртаецца ўвага на месца і ролю злучнікаў у сказе, у тэксце.

Як вядома, д з е я с л о ў-выказнік з'яўляецца адным з важных сродкаў сувязі сказаў у тэксце, што абумоўлена найперш яго роляй як адным з граматычных цэнтраў сказа. Таму важна вывучаць не сам па сабе дзеяслоў як часціну мовы, а з улікам яго функцыянавання ў маўленні, ужывання ў тэксце.

Пры дапамозе дзеясловаў прадметы паказваюцца ў руху, малюецца дынаміка дзеяння. Возьмем для ілюстрацыі наступны тэкст:

*Ад шуму, гвалту, ляманту затрэслася паветра, закурыўся пухам снег, магутная пушча раскатурхалася, разгайдалася, расшумелася, як сялянскі сход, і ўжо ніякая сіла не магла супакоіць яе.*

*Страшная бура завыла над цёмнаю пушчай. Заскрыпелі, застагналі таўшчэразныя гладкакамлёвыя хвоі, густа і жалабна зашумелі кашлатыя яліны, неміласэрна б'ючыся лапамі; завылі асіны, ліпы, бярозы, клёны і вербы; загулі магутныя дубы, і громам грымелі іх чорныя жэралы; зарыгацелі сукаватыя вязы і грабы... Усе дрэвы бушавалі сваімі галасамі, і ў агуле выйшла такая страшэнная музыка, што здавалася, злыя духі пазрываліся з ланцугоў і спраўлялі тут сваё ігрышча.*

*І вось, сярод гэтага гулу пачуўся трэск – не ўтрымаліся крохкія асіны і пасыпаліся, як соль; за імі, як каноплі, разам з карэннямі і з грудамі мёрзлай зямлі, пачалі падаць яліны, цягнучы за сабою і слабейшыя дрэвы. Яны гнуліся, шчапаліся, крышыліся, і толькі камлі іх, як свечкі, тырчалі высока ў паветры, сярод вываратняў і зломаных верхавін, што ўжо трупамі ляжалі ў снягу. А пушча не сунімалася,*

*стагнала, гула, бушавала, плакала злосным плачам, выла гневам і нянавісцю...* (Я. Колас)

Наяўнасць вялікай колькасці дзеясловаў, ці дзеяслоўнасць тэксту, найбольш выразна выяўляюцца ў тэкстах-апавяданнях, што служыць адным з іх адрозненняў ад іншых тыпаў тэкстаў.

Акрамя таго, тэкстаўтваральная роля дзеясловаў заключаецца і ў тым, што дзеясловы-выказнікі ўсіх ці пэўных сказаў тэксту суадносяцца паміж сабой, выступаючы ў адной ці розных трывальна-часавых формах, што з’яўляецца таксама паказчыкам пэўнага тыпу і стылю тэксту, сродкам дасягнення стылістычных мэт і задач тэксту. Так, у тэкстах-апісаннях часцей пераважаюць дзеясловы прошлага ці толькі цяперашняга часу. Напрыклад:

I. *Груша **цвіла** апошні год. Усе галіны яе **былі ўсыпаны** бурным бела-ружовым цветам. Яна **кіпела, млела** ў пчаліным звоне і **распасцірала** ў яго ззянні маленькія, кволыя пальцы новых парасткаў.*

*Аднак **надыходзіла** яе апошняя часіна.*

*Дняпро **падбіраўся** да яе спакваля, як разбойнік. У вечным сваім імкненні скрышыць правы бераг ён **падступаў** у палавень зусім блізка да яго, гвалтоўна **вырываў** кавалкі берага. Потым **адступаў**, і трава літасціва **спяшалася** залячыць раны, нанесеныя Дняпром. А наступнай вясной ён **вяртаўся** зноў. І з часам **абкружыў** грушу з усіх бакоў. Гэты апошні год яна **стаяла** толькі сілай сваіх каранёў.* (У. Караткевіч)

II. *Зіма для птушак – вялікае выпрабаванне. Але **пакутуюць** яны больш не ад холаду, як лічаць многія, а ад недахопу ежы. І асабліва цяжка **бывае** птушкам у марозныя і завірушныя дні, калі ўсё жывое ў лесе быццам **замуроўваецца** ў сваіх патаемных сховішчах. І **ляцяць** тады птушкі да чалавека. У вёсках яны чародкамі **залятаюць** у хлявы, свірны, дзе заўсёды можна чым-небудзь **пажывіцца**, у гарадах – **аблепліваюць** вокны дамоў, **залятаюць** на балконы, а бывае, што **наведваюцца** нават у кватэры. І гэта не дзіва, з такімі паводзінамі птушак мы **сустракаемся** даволі часта.* (З часопіса “Родная прырода”)

Дзеясловы незакончанага трывання выражаюць незавершанае ці паўтаральнае дзеянне без абмежаванняў у часе, а дзеясловы закончанага трывання абазначаюць дзеянні, абмежаваныя ў часе, яны ўказваюць на закончанасць дзеяння ці яго вынік. Гэтыя асаблівасці характарызуюць іх ужыванне адпаведна ў тэкстах-апісаннях і тэкстах публіцыстычнага стылю для фармулявання агульных заканамернасцей (гл. тэксты I, II вышэй) ці ў тэкстах-апавяданнях, дзе важна

падкрэсліць дынаміку дзеяння. Праілюструем апошні тып на прыкладзе наступных тэкстаў:

I. *Грыбная неруш*

*Я паволі пайшоў па сцяжынцы каля цагельнага завода. Мінуў першыя кар'еры, пабрыў па церпкім пахучым палыне да апошніх копанах. Вырашыў зазірнуць у гэты ельнік, раптам ніхто яго не абшнырыў. Помнілася, як мы некалі з бацькам звярнулі са сцежкі і пад самым носам у людзей натрапілі на такую неруш баравікоў. Ужо праз гадзіну вярнуліся дахаты. Маці аж успляснула рукамі ад такой знаходкі. Мы выклалі баравікі на разасланую салому. Маці выпаліла ў печы, нанізала грыбы на пруткі і на бляшанках для булак паставіла сушыцца на гарачы под. А мы пабеглі ў лес другі раз.* (Паводле А. Камароўскага)

II. *Пошукі сына*

*Дарога прывяла старую ў нейкі лясок. Абапал шляху цесна стаялі елкі. У высі шумелі іх верхавіны. На зямлі шамацела змеценае ў каляіны лісце. Блішчалі лужыны мутнай вады. Тэкля ішла па дарозе, абапіраючыся на кій, ледзь пераступала збалелымі нагамі.*

*Лес скончыўся, і дарога пабегла ўніз да самотнай пустой лугавіны. Жанчына раптам прыпынілася. На пагорку незвычайна чыста бялеў каменны абеліск з зоркай наверсе. Тэкля сышла з дарогі і падалася да помніка.*

*Яго нехта нядаўна пабяліў. Невялікая магілка была старанна падпраўленая. Агароджу пафарбавалі ў зялёны колер. На адным баку абеліска чарнела ўмураваная дошчачка са спісам пахаваных байцоў.*

*Старая ўпілася вачыма ў гэтыя радкі жалобных слоў: "Лейтэнант Авяр'янаў, гвардыі старшына Кузняцоў, радавыя Бондараў, Піліпенка, Чарных і іншыя" Не, яго тут не было. Але хто ж гэтыя іншыя?*

*Яна ўжо не магла ісці адтуль. З глыбіні яе грудзей вырвалася страшнае пытанне: "Сыночак мой, дзе ж ты?"*

*Доўга ляцела па паветры яе пытанне. Нема крычала матчына сэрца ад нясцерпнай раны.* (Паводле В. Быкава)

Апошні тэкст, узяты з падручніка для 5-га класа (Малажай, Г.М. і інш. Беларуская мова. Падручнік для 5 класа агульнаадукацыйнай школы з рускай мовай навучання. – Мн.: НІА, 2003, с. 320), прапануецца для пераказу, г. зн. для падрыхтоўкі

другаснага тэксту. Каб папярэдзіць памылкі ў сувязі з навучаннем маўленчай дзейнасці пераказу, лічым неабходным удакладніць адно з заданняў, дадзеных там: “Знайдзіце ў тэксце назоўнікі і дзеясловы. Заўважце, як імі карыстаецца аўтар”, і прапануем правесці гутарку з вучнямі адносна цэлага раду слоў тыпу наступнай:

– *Пра каго расказвае нам пісьменнік?* (Пра маці, якая не ведае, дзе пахаваны яе сын-воін).

– *Як называе яе аўтар на працягу ўсяго тэксту?* (Старая, Тэкля, жанчына, яна).

– *Якая роля прыведзеных назоўнікаў для абазначэння галоўнай гераіні ў тэксце?* (Сродкі сувязі сказаў у тэксце, яго частак; сродкі тэматычнага адзінства тэксту)

– *Назавіце, дзе і якія з названых назоўнікаў злучаюць сказы.* (Назоўнік *Тэкля* ў двух выпадках яго ўжывання).

– *А якія назоўнікі злучаюць часткі тэксту?* (Назоўнік *жанчына* ў другім абзацы, які роўны другой частцы тэксту, і назоўнік *старая*, які пачынае чацвёрты абзац і злучаецца па сэнсе не толькі з папярэдняй часткай, але і з ўсімі папярэднімі для гэтай часткамі).

– *Чаму так разнастайна называе пісьменнік сваю гераіню?* (Ужытыя назоўнікі пашыраюць пра яе інфармацыю: гавораць пра ўзрост (*старая*), даюць яе імя (*Тэкля*), а праз яго можна меркаваць, што жанчына з Беларусі і падзеі адбываюцца тут; дазваляюць пазбегнуць аднастайнасці, паўтору).

– *Якую ролю выконвае займеннік яна ў перадапошнім абзацы тэксту?* (Служыць сродкам сувязі гэтай часткі з усімі папярэднімі на аснове таго, што займеннік не называе, а ўказвае на раней адзначанае, названае назоўнікамі).

– *Ці можна змяніць парадак ужывання назоўнікаў для абазначэння гераіні?* (Можна, але толькі асобных).

– *Чаму займеннік яна патрабуе нашай увагі да яго ўжывання?* (Займеннік нельга паставіць у пачатку апавядання, нядобра будзе яго ўжыванне ў першым і другім абзацах на месцы назоўніка *Тэкля*).

– *Дакажыце, што замена ў двух выпадках назоўніка Тэкля на займеннік яна немагчымы?* (У выніку замены ўзнікае непаразуменне: у абодвух выпадках (пасля назоўніка *старая* – першы абзац і пасля назоўніка *жанчына* – другі абзац) назоўнікі раздзяляюць іншыя сказы, апошні з якіх мае такую ж форму, як і гэтыя назоўнікі (*лужына, вада* – першы абзац, *зорка* – другі).

– *Якія словы цесна звязаны па сэнсе ў першым і другім сказах?* (Словы *дарога* і *шлях*).

– *Як называюцца такія словы?* (Сінонімамі).

– *Якая роля сiнонiма шлях у другiм сказе?* (Сiнонiм служыць сродкам сувязi другога сказа з першым ).

– *Якiя яшчэ сiнонiмы выкарыстаны ў тэксце?* (Сiнонiмы *абелiск, помнiк*).

– *Для чаго iх ужывае пiсьменнiк?* (Каб не паўтараць адно i тое ж слова i дакладна назваць у першым выпадку вiд помнiка).

– *Цi ёсць розніца памiж iмi?* (Ёсць, паколькi *абелiск* – гэта разнавiднасць помнiка, лексема мае значэнне ‘помнiк у гонар якой-небудзь падзеi або на ўшанаванне чыёй-небудзь памяцi ў выглядзе высокага, звычайна кантовага, слупа, звужанага ўверсе’).

– *Цi добра было б спачатку ўжыць сiнонiм помнiк?* (Не зусiм, таму што нельга было б спалучыць назоўнiк *помнiк* з дапасаваным азначэннем *каменны* i недапасаваным – *з зоркай наверсе*).

– *Якiя формы дзеясловаў выкарыстаны ў тэксце?* (Дзеясловы закончанага трывання, абвеснага ладу, прошлага часу).

– *Якую сiнтаксiчную ролю яны выконваюць у сказах i тэксце?* (Дзеясловы ў сказах выконваюць сiнтаксiчную ролю выказнiкаў, а ў тэксце – гэта сродкi сувязi сказаў i частак тэксту).

– *Чым можна гэта растлумачыць аднастайнасць трывальна-часавай формы дзеясловаў у тэксце?* (Яна служыць адлюстраванню дынамiкi дзеянняў, iх паслядоўнасцi i закончанасцi ў апавяданнi).

– *Знайдзiце сiнонiмы сярод дзеясловаў-выказнiкаў.* (Сiнонiмы *iшла – падалася*).

– *Падбярыце iншыя сiнонiмы да дзеяслова iсцi.* (*Iсцi – бегчы, плесцiся, цягнуцца, пхнуцца, паўзцi, трухаць...*).

– *Цi можна з прыведзеных сiнонiмаў выбраць замену дзеяслову падацца? Калi не, то чаму?* (Не, паколькi ўсе яны ўнясуць неадпаведнасць памiж апiсаннем стану жанчыны, сiтуацыяй, яе узростам i сэнсам дзеяслова).

– *Чым растлумачыць ужыванне сiнонiма падалася ў гэтым кантэксце?* (Гэта тое адзiнае, правiльнае слова для перадачы ўзрушанасцi жанчыны з улiкам яе ўзросту i стану)...

Толькi пасля такой дэталёвай гутаркi вучнi пераходзяць да складання другаснага тэксту апавядання.

Нярэдка ў тэксце выкарыстоўваюцца розныя формы дзеясловаў, як, напрыклад, у наступным:

(1) *Запомнi гэтую дату – 6 жнiўня 1517 года – дзень нараджэння нашага кнiгадруку.*

(2) *Для нас ён сёння здаецца святам – адбылася падзея вялiкага гiстарычнага значэння для ўсяго ўсходняга славянства.* (3) *А для Скарыны гэта быў яшчэ i чарговы турботны дзень.* (4) *У друкарню*

*трэба было завезці новыя пакі паперы, а з пераплётчыкам дамовіцца пра аправу кніг...* (А. Клышка)

Сказы ў тэксце звязаны лінейнай сувяззю: другі з першым – займеннікавай (*дзень – ён*), трэці з другім і першым – паўторам назоўніка *дзень* і далучэннем сказа з дапамогай злучніка *а*, які набывае супраціўнае значэнне, што і пацвярджаецца зместам (нам гэты дзень – свята, а Скарыне – дзень турбот). Тэкст характарызуецца выкарыстаннем розных формаў выражэння выказнікаў. У зачыне – першы сказ – выкарыстоўваецца дзеяслоў загаднага ладу ў форме 2-ой асобы адзіночнага ліку, выражаючы пабуджэнне, параду, але адрасавана яна не да адной асобы, а да ўсіх і кожнага. У асноўнай частцы тэксту (ад другога па чацвёрты сказы) у большасці ўжыты дзеясловы закончанага трывання ў форме прошлага часу, яны абазначаюць дзеянні, якія адбыліся ў мінулым, але іх вынікі і сёння важныя. Розныя формы дзеясловаў-выказнікаў указваюць на змену падзей і разам з тым служаць сродкам сувязі сказаў у адно цэлае.

Змешаны характар дзеясловаў-выказнікаў звычайна не перарывае звязанасці апісання, але служыць для падкрэслівання важнасці вынікаў дзеяння, якое адбылося ў мінулым і абазначана дзеясловамі закончанага трывання прошлага часу, цяпер, у момант гутаркі. Напрыклад:

*Ужо снег **злез** увесь з зямлі. Толькі на лузе **блішчыць** яшчэ лёд і снег. Моцна **спіць** рака, крэпка **закаваў** яе мароз. А равальчыкі не **дрэмлюць. Шумяць** яны ў полі, **бягуць** к рэчцы і **пачынаюць** будзіць яе.* (Я. Колас)

Такім чынам, у выніку аналізу тэкстаў вучні засвойваюць ролю дзеясловаў-выказнікаў як аднаго са сродкаў сувязі сказаў, выяўляюць і асэнсоўваюць ролю і значнасць трывальна-часавых формаў дзеясловаў у розных тыпах тэкстаў, вучацца правільна і да месца ўжываць дзеясловы ва ўласных тэкстах.

П р ы с л о ў е, паводле прынцыпу ўліку тэкстаўтваральнай ролі розных часцін мовы, таксама найлепш вывучаць не ізалявана і нават не ў сказе, устанаўліваючы да дзеяслова ці назоўніка адносіцца прыслоўе, яго сінтаксічную функцыю, а ў тэксце, дзе выяўляюцца ўсе і розныя, а не толькі гэтыя асаблівасці ўжывання прыслоўя ў маўленчай дзейнасці чалавека. Пры гэтым варта заўважыць, што ў тэксце прыслоўі часцей за ўсё абазначаюць акалічнасныя прыкметы дзеяння, стану, працэсу, як, напрыклад, у прыведзеных ніжэй тэкстах:

I. *Прыгажосць народнай песні*

*Які гэта неацэнны скарб – простая і ў той жа час задушэўная народная песня! Яна ўвабрала ў сябе – рупліва і на вякі – не толькі непаўторны каларыт роднай мовы. У свае дзівосныя мелодыі яна шчодра ўпляла ўсе гукі роднай зямлі, усю прыгажосць бацькоўскага краю, мудрасць народа, яго сардэчнасць і прастату.*

*Як і ў кожнай іншай, у гэтай песні было нешта сваё, адметнае. Напачатку яна лілася нетаропка, спакваля, як плыткія рачулкі ў зарасніках вербалозу. Далей, пры паўторы першага радка, песня шырока распраўляла крылы, як векавечны бор у навальніцу. Праз расчыненыя вокны яна вырвалася на прастор, сягнула за вёску – на разлогі калгасных палёў, упершыню пасля зімы багата вымытыя цёплым дажджом.* (Паводле В. Праскурава)

II. *х х х*

*Мы лічым, што праводзім час,*
*Хто похапкам,*
*А хто – паволі.*
*А гэта час*
*праводзіць нас,*
*Каб болей*
*Не сустрэць ніколі!* (Р. Барадулін)

Аднак нярэдка (праўда, усё ж радзей, чым назоўнік і дзеяслоў) прыслоўі з'яўляюцца словамі-апорамі тэксту, сродкамі сэнсавай і ідэйнай асновы тэксту. Так, пры апісанні ўтварэння калгаса ў Куранях, для перадачы новага, якое перамагае, і разам з тым для адлюстравання складаных пачуццяў куранёўцаў Іван Мележ прыбягае да паўторнага выкарыстання прыслоўя *разам* (дарэчы тут і яго сінонім *гуртам*) як сэнсавага цэнтра тэкставага фрагмента, як сродку сувязі сказаў:

*Праца разам*

*Пасля таго як дакасілі, **разам** ужо выходзілі і жаць. Станавіліся ў рад, зажыналі ўсе адразу і ішлі так, згінаючыся, кладучы за сабой снапы, пакуль на паласе не жаўцела адно пожня. **Разам** састаўлялі бабкі. Калі зжыналі адну паласу, **гуртам**, гамонячы, ішлі ўсе на другую.*

***Разам*** *і звозілі снапы. Яшчэ кожны на сваім возе, на сваім коніку, але ўжо не на свае гумны, а на прызначаныя. Жыта – у Хведарава гумно, авёс і пшаніцу – у Грыбковае, а грэчку і проса – да Алёшы Губатага. Гэта больш за ўсё ўражвала куранёўцаў. Усё ж стагі і бабкі, хоць і касілі і жалі* ***разам****, стаялі ў кожнага на сваім надзеле, былі яшчэ нібы сваімі, асобнымі. Тут пачыналася ўжо іншае.* (І. Мележ)

Прыслоўі выступаюць сродкамі тэматычнай сувязі тэкстаў-апісанняў прасторы памяшканняў, асяроддзя, і сродкамі сувязі сказаў, напрыклад, як у наступным вершы Янкі Купалы:

*Лес*

*Ці знаеш ты, дзяцюк нядбалы,*
*І ты, дзяўчынка дарагая,*
***Лес*** *гэты цёмны,* ***лес*** *падгалы,*
*Што з веку ў век нам байкі бае?*
*Цікавым вокам і думою*
*Шмат пераняць чаго* ***там*** *можна,*
*Як* ***там*** *усё само сабою*
*Жыве паважна, асцярожна.*
***Там*** *звер туды-сюды шнуруе,*
*На галлі птушка* ***там*** *мрасецца,*
***Там*** *хвойка з хвойкаю талкуе,*
*Як дзе кума з кумой на рэчцы.*
*Зімой сапе сцюдзёнай думай,*
*Улетку песнямі уп'ешся,*
*А ўвосень* ***там*** *– ах, шумы, шумы!*
*Не чуй – слязою аблiешся!*
*Няхай жа свісне ў* ***ім*** *сякера:*
*Застогне бедны* ***ён****, застогне...*
*О* ***пушча****, цёмная не ў меру,*
*Чыя душа з табой не дрогне?!*

Пры аналізе гэтага тэксту варта звярнуць увагу на сувязь зачыну (першая страфа-сказ) і канцоўкі (апошняя страфа) праз сінонімы *лес – пушча* і займеннікі *ім, ён*. А сувязь асноўнай часткі з зачынам, як і сказаў паміж сабой у асноўнай частцы, ажыццяўляецца з дапамогай займеннікавага ўказальнага прыслоўя *там*, выяўляючы ў тэксце яго паўтор.

Асабліва часта тэкстаўтваральную функцыю выконваюць прасторавыя прыслоўі. Напрыклад, Якуб Колас выкарыстоўвае

акалічнасныя прыслоўі месца пры апісанні магутнага дуба для больш дакладнага адлюстравання месцазнаходжання дуба, яго ўспрымання зрокава:

*Сілачом стаіць*
*Дуб разложысты*
*І **здалёк** відаць*
*Пышны верх яго.*
*А **ўнізе** пад ім*
*Нёман коціцца,*
*срэбрам-стужкаю*
*Павіваецца.*
*У нагах трава*
***Нізка** сцелецца,*
*А вакол ляжыць*
*травяністы луг.*
***Углыб** зямлі ўвайшлі*
*Карані яго.*
*Крэпка дуб стаіць,*
*Не варушыцца!*
*Так размашыста*
*Параскіданы*
*Ва ўсе стораны*
*Лапы крэпкія.*
*Камель – слуп-скала,*
*Дыша сілаю.*
*А **ўгару** зірнеш –*
*Шапка валіцца.*
*Дуж ты, дуб стары,*
*Сын вякоў сівых!*
*Многа бур ты знёс*
*На вяку сваім!*
*Налятаў віхор*
*З навальніцаю,*
*Ды не гнуўся ты*
*Перад бураю!..*

А Максім Гарэцкі выкарыстоўвае акалічнасныя прыслоўі месца пры апісанні надыходу вясны, калі найбольш прыкметна заўважаюцца змены *ўнізе*, на зямлі, і *ўверсе*, у небе:

*Вясна, вясна красная!*

*На ўзгорках ужо праталінкі, а* ***ўніз*** *бягуць цуркі звонкія, на сонейку блішчаць.*

*А* ***ўверсе*** *– неба сіняе, чыстае! А ў паветры свежанькім, веснавым – жаўраначак, нябачны ў вышыні: цюр-цюр!.. цюр-цюр-цюр!.. цюрлі – рлі!..*

*Вясна, вясна красная!*

Другая асабліва заўважная роля прыслоўяў – гэта іх выкарыстанне як сродку часавай сувязі сэнсава самастойных частак тэксту, ці ЗФА. Для ілюстрацыі возьмем наступны тэкст:

(I) *Раніцай падзьмуў паўднёвы вецер. Ён прынёс па-вясноваму мяккую цяплынь і безліч забытых за зіму пахаў.* (II) *Апоўдні пад несціханы крык пеўняў з-за лесу выпаўзла густая блакітна-шэрая хмара. Яна заняла паўнеба і, нібы замарыўшыся, спынілася недзе над Данькавам.*

(III) *Ноччу секануў буйны цёплы дождж. У непрасветнай цемрачы – хоць выкалі вока – ён глуха лапатаў, сіпеў, растапляючы снег; гулі і звінелі імклівыя ручаіны. Усё навокал набрыняла вадой і цеплынёй. Было духатліва і парна, аж ламала косці.*

(IV) *А назаўтра, абмытыя дажджом, непрывычна чарнелі палі. За ноч снег нібы злізала. Усё навокал памаладзела. Лысы пагорак зелянеў маладой рунню, і канава на імшары таксама зелянела ад асакі. А вярба за ноч пажаўцела, бо набрынялыя пупышкі патрэскаліся і з іх здзіўлена пазіралі на свет жоўтыя коцікі.* (Паводле А. Асіпенкі),

дзе выдзяляюцца чатыры ЗФА (I; II; III; IV), сувязь паміж якімі, акрамя іншых сродкаў, ажыццяўляецца дзякуючы ўжыванню прэпазіцыйна выдзеленых, акрамя другога ЗФА, прыслоўяў *раніцай, апоўдні, ноччу* і ў апошнім – прыслоўя *назаўтра* са злучнікам *а*, тым самым завяршаючы тэкставы фрагмент, падводзячы рысу апісання прыходу вясны ў часавым вымярэнні на працягу адрэзкаў адных сутак – *раніцай, апоўдні, ноччу* і пасля іх – *назаўтра*.

А вось яшчэ адна ілюстрацыя злучальнай функцыі, але ўжо антанімічных прыслоўяў, якія служаць сродкам сувязі двух ЗФА ў адзіны тэкст, на прыкладзе тэкставага фрагмента з апавядання “Галя” Янкі Брыля:

(I) ***Калісьці****, пры панах, гэта быў хутар. З шасцю дзесяцінамі добрага поля адразу за садам, з новым вялікім гумном, двума хлявамі і малой старасвецкай хатай. Без шчыта яна, наўкруг накрытая саломай, зялёнай ад моху, нізка насунутай на малыя прыплюшчаныя*

*вокны. Так і глядзела на свет, як сам гаспадар, заўсёды зажмураны Данька, стары Хамёнак, бязлобая галава якога нібы ўрасла ў зімовую шапку – аблезлы, раней, калі верыць старому, гарадскі каракулевы каўпак.*

(II) ***Цяпер*** *гэты каўпак недзе яшчэ ўсё валяецца на гарышчы, а сам Данька Хамёнак ляжыць на ўзгорку пад хвойкамі і муравой. Ад хутара застаўся толькі сад, скрыпучы журавель над зрубам студні і тая самая хата.*

*У хаце ад усёй Хамёнкавай сям'і ўцалела толькі нявестка Галя з дзецьмі, хлопцам і дзяўчынскай.* (Я. Брыль)

У тэксце дакладна вызначаюцца дзве адносна закончаныя сэнсавыя часткі (I; II), якія сэнсава злучаны паміж сабой антанімічнымі прыслоўямі *калісьці*, што аб'ядноўвае першую структурную частку тэксту вакол сябе, і *цяпер*, што аб'ядноўвае сказы другой часткі (у аўтара выдзелены два абзацы для больш выразнага ўспрымання паведамлення аб тых, хто цяпер жыве ў старой хаце Хамёнка), а разам для адлюстравання таго, што было *калісьці* і што засталося *цяпер*, а прыслоўі выступаюць сродкамі развіцця тэксту на параўнанні і супрацьпастаўленні. Варта звярнуць увагу і на паўтор назоўніка *каўпак* у апошнім сказе першага ЗФА і ў першым сказе другога ЗФА, але пры гэтым неабходна падкрэсліць яго ролю, як і назоўнікаў *Данька, Хамёнак, хутар, сад, хата,* у стварэнні тэматычнага адзінства тэксту, для забеспячэння сэнсавай сувязі яго частак.

Такім чынам, пры вывучэнні прыслоўя адбываецца зноў жа апярэжвальнае вывучэнне сінтаксіса, якое поўнасцю раскрывае значэнне прыслоўя ў сказе і тэксце, у якім сказы звязваюцца адзін з другім лінейным і паралельным спосабамі.

Сярод усіх службовых часцін мовы толькі з л у ч н і к і выдзяляюцца тэкстаўтваральнай функцыяй. Вось чаму вывучаць злучнікі, асабліва іх падзел паводле функцыянальнага значэння, можна і патрэбна на матэрыяле тэкстаў, бо толькі ў іх выяўляюцца ўсе разнавіднасці сінтаксічных адзінак, у якія ўваходзіць злучнік, і ўсе разнавіднасці тэкстаўтваральнай функцыі злучнікаў.

Зразумела, што найперш выяўляецца роля злучнікаў для сувязі членаў сказа, калі злучнікі злучаюць два члены, паўтараюцца пры паслядоўным ці папарным далучэнні аднародных членаў. Напрыклад:

*Песня* ***і*** *казка / Ходзяць у пары, / Сеюць па свеце / Дзівы* ***і*** *чары...* (Я. Купала); *Бабка Параска цяжка ўздыхнула* ***і*** *выйшла з пакоіка...* (Я. Колас); *Мы збераж.ом* ***і*** *зубраў,* ***і*** *чалавечнасць,* ***і*** *старыя вежы,* ***і*** *ўсплескі бабра,* ***і*** *дзіва сонечных палян,* ***і*** *вуркатанне дзікага голуба,* ***і***

*святую гучную цішыню...* (У. Караткевіч); *Лістападу радуйся* ***і*** *снежню, /* ***І*** *вятрам асеннім,* ***і*** *снягам...* (П.Панчанка)

Тут ілюструюцца толькі асобныя сказы з тэкстаў з найбольш выразнай роляй злучніка *і* як службовай часціны мовы, якая звязвае аднародныя члены сказа.

Дарэчы тут узгадаць і аб граматыка-стылістычных патрабаваннях да ўжывання аднародных членаў сказа, іх спалучэнні ў сказах і выкарыстанні злучнікаў. Так, пры аналізе і ўтварэнні навуковых тэкстаў варта ведаць наступныя:

1) аднародныя члены сказа часцей за ўсё аб'яднаны інтанацыяй пералічэння з далучэннем апошняга ці злучэннем двух аднародных членаў злучнікам *і*, калі рад закончаны, калі маецца поўны пералік, і без злучніка *і* перад апошнім аднародным членам з ліку названых пры незакрытым радзе, незакончаным пераліку прыкмет, з'яў, дзеянняў і пад., напрыклад: *Усе часціны мовы (акрамя выклічніка) падзяляюцца на самастойныя* ***і*** *службовыя. Да самастойных часцін мовы адносяцца назоўнік, прыметнік, лічэбнік, займеннік, дзеяслоў* ***і*** *прыслоўе; Барацьба, супрацьстаянне, варожасць, адкрытая ці тайная канфрантацыя накладвалі адбітак на стан усяго грамадства, па-свойму праламляліся ў яго культуры, мастацтве;*

2) з раду злучнікаў *але, а, ды* для навуковых тэкстаў характэрна ўжыванне злучніка *але* для выражэння супраціўных сэнсавых адносін паміж аднароднымі членамі, а для выражэння супрацьстаяння – парны злучнік *не толькі – але і*, напрыклад:

3) аднародныя члены сказа павінны афармляцца так, як аформлена абагульняльнае слова пры іх, г. зн. мець аднолькавую форму, напрыклад, у сказе *Паласатая цыкада, цыкадка, тля, азімая соўка, шведская муха, сеткавы слізняк – усіх гэтых шкоднікаў раслін трэба ведаць, каб не несці страты ўраджаю* форму назоўнага склону аднародных членаў сказа патрэбна змяніць на форму вінавальнага склону: *паласатую цыкаду, цыкадку, тлю, азімую соўку, шведскую муху, сеткавага слізняка*, паколькі абагульняльнае слова *ўсіх* стаіць у форме вінавальнага склона;

4) у якасці аднародных членаў сказа могуць быць словы і не могуць быць слова (-ы) і часткай, якая паводле свайго афармлення суадносіцца са сказам (-амі), напрыклад, у сказе *Даследчыку важна ведаць важнейшыя прыкметы, характэрныя ўласцівасці і дзе вырошчваюцца зерневыя культуры* патрэбна паправіць, паколькі аднароднымі членамі з'яўляюцца *прыкметы, уласцівасці*, але гэта не распаўсюджваецца на канструкцыю *дзе вырошчваюцца зерневыя культуры*: *Даследчыку важна ведаць важнейшыя прыкметы,*

*характэрныя ўласцівасці і раёны (рэгіёны, месца) вырошчвання зерневых культур.*

Акрамя пералічаных граматыка-стылістычных патрабаванняў для ўжывання аднародных членаў сказа, патрэбна ўзгадаць і правілы логікі:

1) пры пабудове сказаў з аднароднымі членамі важна ўлічваць аднесенасць іх да аднаго тыпу, напрыклад, пры пераліку колеру чарэшні – *жоўты, чырвоны, чорны* – нельга ўключаць назвы гатунку тыпу *Залатая лошыцкая, Мускатная, Народная, Паўночная* і інш., і наадварот;

2) члены пералічэння падзелу павінны ўзаемна выключацца, напрыклад, *дзеці і старыя, старыя і малыя, маладыя і старыя,* але нельга *маладыя і юныя, дарослыя і старыя* і інш.;

3) калі абагульняльнае слова абазначае родавае паняцце, то яго аднародныя члены павінны выступаць у якасці відавых, напрыклад: *Дамы, палацы, цэрквы, касцёлы – усе будынкі ўлічаны на тэрыторыі горада.*

Важна паказаць вучням, якую ролю выконваюць аднародныя члены сказа ў пабудове тэкстаў. Так, пры вывучэнні знакаў прыпынку пры аднародных членах сказа з абагульняльнымі словамі засяроджваецца ўвага на выкарыстанні іх пры пабудове тэксту. Адным са спосабаў пабудовы зачыну і/ці канцоўках тэкстаў з'яўляецца выкарыстанне аднародных членаў ці абагульняльных слоў, а сказы асноўнай часткі могуць развіваць думку паслядоўна выкарыстоўваючы аднародныя члены, тым самым служачы развіццю думкі ад уступу да канцоўкі. Яскравай ілюстрацыяй адной з такіх пабудоў тэксту можа служыць наступны верш Максіма Танка:

*Мурашы і поле*

***На ўсіх паверхах*** *поля* ***<u>зёлкі ды стварэнні</u>***
*Працуюць, каб наблізіць век благаславенны.*
***На самым доле*** ***<u>мурашы</u>*** *па падзямеллях*
*Снуюць між саламяных медных капітэляў.*
***Вышэй там*** *–* ***<u>павітуха</u>*** *на сваіх арбітах,*
*Якіх імклівы бег ад вока нават скрыты.*
***Далей там*** ***<u>васількі</u>*** *блакітам адзначаюць*
*Праменні сонца, што ў калоссі патанаюць.*
***Вышэй*** *– даўжэзныя, як вечнасці хвіліны,*
*Губляюцца ў празрыстым леце матыліным.*
***А побач*** *–* ***<u>нашы рукі</u>****, скрутыя нібыта,*
*Супольна граюць на цымбалах жыта.*
***Яшчэ вышэй****, пад ветру порцікам чмяліным,*

*Гул абвяшчае аб даспеласці раслінаў.*

***Яшчэ вышэй** – **сцяжкі** над вежай збожнай працы,*

*Узняўшыся, птушынай чарадой мігцяцца.*

*Так вырастае поле з працы **ўсіх стварэнняў**,*

***З духмяных зёлак, звону, нашых рук, праменняў***. (М. Танк).

Тэкст верша складаецца з трох частак. У зачыне – першы сказ – паведамляецца пра *ўсе паверхі поля*, што адразу патрабуе працягу ці тлумачэння, аб якіх паверхах ідзе размова, і пра *зёлкі і стварэнні*, што зноў, асабліва апошні назоўнік, вымушае да раскрыцця, пашырэння інфармацыі аб іх. Менавіта гэта і пацвярджаецца ў асноўнай частцы, калі з дапамогай акалічнасцей месца (*на самым доле*, *вышэй там*, *далей там*, *вышэй*, *яшчэ вышэй, яшчэ вышэй*) і назоўнікаў-дзейнікаў (*мурашы*, *павітуха*, *васількі, рукі*, *гул*, *сцяжкі*) у іх пераліку ў асобных сказах ці частках складаных сказаў паслядоўна раскрываецца тэма твора – працаўнікі поля. І апошні сказ-канцоўка падводзіць вынік, указваючы, што поле вырастае з працы "ўсіх стварэнняў, з духмяных зёлак, звону, нашых рук, праменняў", часткова паўтараючы змест першага, змыкаючыся з ім, завяршаючы такім чынам паведамленне.

Але вернемся да вызначэння месца і ролі злучнікаў у тэкстах, паколькі яшчэ адна разнавіднасць функцыянальнай ролі злучнікаў – спалучаць часткі складаных сказаў, а ў залежнасці ад тыпу гэтых сказаў выкарыстоўваюцца злучальныя (у складаназлучаных) і падпарадкавальныя (у складаназалежных) злучнікі ў іх разнавіднасцях паводле значэння. Напрыклад:

*Цяпер грамада раскідалася на кучкі. Кожная кучка мела свайго прамоўцу. Адны гаварылі так, другія іначай. Сяляне раздзяліліся на дзве часткі. Меншая частка, маладыя мужчыны, стаялі за тое, каб не даць каморніку паставіць капцы. Другія, сталыя мужчыны, гаварылі, што так рабіць нядобра, бо ўмяшаецца паліцыя, і ім жа горш будзе. Проці гэтага довады ніхто не мог сказаць, бо ўсім было на памяці, як гадоў тры таму была сварка з суседнім дваром і як у гэтую сварку ўмяшалася паліцыя. І не ўсе яшчэ сяляне, якіх тады арыштавалі, вярнуліся з астрога за супраціўленне начальству.* (Я. Колас)

Вучні чытаюць тэкст, вызначаюць віды і сродкі сувязі сказаў, іх тыпы і ўстанаўліваюць ролю выдзеленых у іх злучнікаў.

Асобна варта гаварыць аб функцыі злучнікаў як сродках сувязі сказаў у тэксце, зразумела, побач ці ў спалучэнні з іншымі тэкстаўтваральнымі сродкамі, як, напрыклад, у наступным тэксце:

(1) *Ні адзін сейбіт не кіне зерне ў непадрыхтаваную глебу.* (2) ***І душу**, каб у ёй прараслі зерні дабрыні, трэба падрыхтаваць.* (3) *Трэба навучыць **яе** адчуваць.* (4) ***Душа чалавека** мудрэйшая за розум **яго**.* (5) ***Чалавек** меў пачуцці яшчэ да таго, як навучыўся выказваць іх словамі.* (6) ***І дзіця** спачатку спасцігае свет з дапамогаю пачуццяў.* (7) ***Яно** ўлоўлівае пяшчоту ў голасе маці, у кожным яе дотыку.* (В. Вітка)

У тэксце з паслядоўнай лінейнай сувяззю пасля першага сказа-зачыну ідзе другі, які, акрамя ўнутранай сувязі, звязаны з ім пры дапамозе знешняга паказчыка – далучальнага злучніка *і*, як і шосты сказ з пятым.

А цяпер разгледзім прыклад, дзе злучнік выконвае яшчэ адну важную функцыю ў тэксце – злучае самастойныя сэнсавыя часткі яго, ці ЗФА. Напрыклад:

(I) *Красавала вясна і дарыла шчодра вянкі, яснюсенькім золкам завівалася на ўсходзе, у бліскучай плыні купалася ў поўдзень, залатымі іскрамі залівала захад і расплятала з сваіх цёмна-русых кос агністыя стужкі і развешвала іх на бязмежных прасторах... Красавала вясна і дарыла шчодрыя вянкі.*

(II) ***І** шумела буйнае лісце на Кучаравым дрэве, галасна **шумела** зялёнае. А **ў гэтым шуме** чуліся рытмы жыцця, сталыя аповесці аб тым, што тварылася навакола «пад родным небам», «на зачарованых гонях». І ціша і громы пакідалі сляды на струнах Кучаравага дрэва, і ў перамовах яго буйнага **лісця** чуўся іх голас. Лашчыла **лісце** ноч і разгортвала перад ім і чары свае, і таемнасць сваю, і тыя падзеі, што адбываліся пад заслонаю змроку.*

(III) ***І** сыходзіліся русалкі чарадою пасядзець на карэннях Кучаравага дрэва і паслухаць **шум лісця**. І лясун развешваў струны гусляў сваіх, каб пераняць песенныя чары зялёных **лістоў**.*

(IV) *Гучна шумелі суседнія дрэвы, гул задавальнення бег ад вяршыні да вяршыні. Так разносіўся голас Кучаравага дрэва па лесе, так шумела буйнае лісце ў росквіце вясны.*

*Але не адным толькі гэтым жыло Кучаравае дрэва. Можа я не зусім дакладна выкажу сутнасць яго прыроды, калі скажу, што дваістым жыццём жыло Кучаравае дрэва.* (Я. Колас)

У тэксце выразна выяўляецца роля злучнікаў у сказе і паміж сказамі пэўнага звышфразавага адзінства, але звяртаецца ўвага на выкарыстанне пісьменнікам злучнікаў у ролі аб’яднання ЗФА ў адно цэлае – у тэкст, прысвечаны апісанню жыцця Кучаравага дрэва ў

перыяд красавання вясны. Так, другое ЗФА далучаецца са сваёй падтэмай – буйнае лісце Кучаравага дрэва вясною – з дапамогай злучальнага, дакладней далучальнага, паводле функцыі злучніка *і*. Гэтак жа далучана да папярэдняга кантэксту і трэцяе ЗФА, хаця тут і маецца паўтор пэўных адзінак (*шум лісця*) для семантычнай сувязі гэтай часткі тэксту з папярэдняй. Важна падкрэсліць, што злучнік, які вынесены ў прэпазіцыю сказа, а тым больш асобнай часткі тэксту, адцягвае ўвагу ад асобнага сказа, ён служыць адным са скрэпаў адзінага шляху думкі, логікі выкладу ў тэксце.

**2.3 Роля і месца пабочных слоў у тэксце**. Пабочныя словы – гэта своеасаблівыя словы ў тэксце, паколькі яны, з аднаго боку, не з'яўляюцца членамі сказа, з другога – даюць магчымасць моўцу ацэньваць сваё маўленне ці яго частку. Гэта найперш нязменныя словы, якія іншых слоў у сказе не паясняюць, самі не называюць іншых прадметаў, прыкмет, дзеянняў, а толькі паказваюць адносіны таго, хто гаворыць, да рэчаіснасці: выражаюць упэўненасць, перакананне ў тым, пра што гаворыць моўца, ці няўпэўненасць, меркаванне і інш. Напрыклад:

*Гусіныя пёры*

*Вы, **пэўна**, ведаеце, што ў даўніну людзі пісалі гусіным пяром. Але не ведаеце, **пэўна**, што толькі шэсць, ад сілы дзесяць пёраў з усяе гусі былі прыдатнымі для пісьма. І вырывалі іх у жывых птушак. Прытым з левага крыла: іх выгін найбольш адпавядаў, каб пісаць праваю рукой.*

***Праўда**, пісалі яшчэ і іншымі пёрамі – крумкачынымі, ястрабінымі, качынымі і нават лебядзінымі. А некаторыя лічылі, што сама лепш пісаць цецеруковымі. Але найбольш пашыраныя былі гусіныя – з-за іх гнуткасці і трываласці. І не ў апошнюю чаргу таму, што гэтыя пісьмовыя прылады разгульвалі па двары.*

***Мажліва**, нездарма гусь такая важная і задзірлівая. І калі яна ўткне цябе за нагу, не вельмі крыўдуй – успомні яе заслугі і ўступі ёй дарогу...* (А. Клышка)

У тэксце ўжыты паасобныя пабочныя словы. Так, першыя два сказы ўтрымліваюць пабочнае слова *відаць*, якое выкарыстана з мэтай выразіць няпэўнасць аўтара, яго сумненне наконт ведаў чытачоў пра пэўныя факты адносна гусіных пёраў і адносіцца да часткі сказа. А вось два другія пабочныя словы, акрамя выражэння адносін аўтара да

рэчаіснасці, служаць і іншым мэтам: яны выступаюць своеасаблівымі скрэпамі новых частак тэксту да папярэдніх, выконваюць тэкстаўтваральную ролю. Так, будаўнічая роля першага – *праўда* – у злучэнні часткі тэксту, якая мае падтэму гусіныя пёры сярод іншых пёраў, з папярэдняй, а другое – *мажліва* – служыць пабудове заключэння тэксту, г. зн. падагульненню ўсяго выказвання, і адносіцца да ўсёй часткі.

А вось тэкст-разважанне безыменнага верша Максіма Танка з выкарыстаннем паўтору пабочнага слова *можа* як сродку далучэння сказаў пры выказванні пэўных меркаванняў аўтара:

*Што найсумнейшае ў свеце?*
*Восеньскі дождж несціханы?*
***Можа**, лістоў ападанне,*
*Крык жураваў развітальны?*
***Можа**, скрып весніц, з якімі*
*Толькі бяседуе вецер,*
*Скарга самотнае скрыпкі,*
*Плач немаўля на дасвецці?*
***Можа**, чаканне таго, чый*
*След перамецены пылам?*
***Можа**, старэнне жанчын,*
*Тых, якіх зналі, любілі?*
*Не шкадаваў бы нічога:*
*Ні маладосці гарачай,*
*Ні сваіх сіл, – каб на свеце*
*Гэта ўсё змог перайначыць.*

Тэкст верша складаецца з чатырох абзацаў. Ён мае зачын – першы пытальны сказ, які выяўляе тэму; асноўную частку з другога па перадапошні сказы, з якіх амаль кожны, акрамя пераліку назоўнікаў, якія забяспечваюць тэматычнае развіццё думкі, уводзіцца з дапамогай пабочнага слова *можа* як сродку выражэння меркавання і сродку сувязі пытальных сказаў; і заключэння – апошняга сказа-страфа, у якім падводзіцца вынік, робіцца заключэнне роздуму паэта ці яго лірычнага героя. Дарэчы тут заўважыць і аб ролі абагульняльнага слова – займенніка *ўсе* як сродку пабудовы канцоўкі тэксту.

Праўда, яшчэ задоўга да вывучэння пабочных слоў неабходна звяртаць увагу вучняў на тое, што пабочныя словы ў навуковых тэкстах абмежаваны тымі, якія ўказваюць на адносіны паміж часткамі выказвання, нясуць дадатковыя звесткі, тлумачэнні, удакладненні, папраўкі, што навуковым тэкстам не ўласцівы сказы з пабочнымі

словамі, якія выражаюць эмацыянальную ацэнку выказвання ці яго экспрэсіўны характар. Так, напрыклад, пры знаёмстве з тэкстамі тыпу разважання, асабліва навуковага, дакладней, навукова-вучэбнага стылю, і з мэтай падрыхтаваць да складання ўласных навуковых тэкстаў можна параіць вучням звярнуцца да наступнай табліцы:

| Сачыненне-разважанне | |
|---|---|
| Схема сачынення | Пабочныя словы |
| 1. Тэзіс | 1. *Па-мойму, ..*<br>*На маю думку, ..*<br>*Здаецца, ..* |
| 2. Аргументы | 2. *Па-першае, ... Па-другое, ... Па-трэцяе, ..* |
| 3. Вывад | 3. *Такім чынам, ..*<br>*Адным словам, ..*<br>*Зразумела, ..* |

Тут відавочным становіцца роля пабочных слоў як сродкаў увядзення уступу, ці зачыну, тэксту, пабудовы асноўнай часткі, якая можа складацца з некалькіх сказаў-аргументаў ці некалькіх абзацаў у залежнасці ад аб'ёму інфармацыі, якая ўводзіцца пры дапамозе пабочных слоў, што ўказваюць на парадак размяшчэння ці пералік доказаў, а таксама канцоўкі тэксту, у якім абагульняецца ўся інфармацыя і робіцца вывад, які пацвярджае ці адмаўляе заяўлены тэзіс ў зачыне.

Так, нярэдка думка, пэўнае палажэнне падзяляе клас на два лагеры, пачынаецца дыялог, часцей спрэчка, а яшчэ часцей проста адны выступаюць за, другія – супраць. У такім разе, як слушна зазначае спецыяліст і выключны майстар прыгожага маўлення А.Я. Міхневіч, характар дыялога "і, у адпаведнасці з этымалогіяй слова (грэц. *polemicos* значыць '*ваяўнічы, варожы*'), патрабуе ад удзельніка дыялога ўменне весці "вайну" ідэй, разваг, эрудыцый, доказаў, аргументаў, трапных і дасціпных рэплік і нават характараў" [2, с. 179].

Галоўным з'яўляецца навучыць шукаць аргументы і спосабы іх падачы. Напрыклад, каб даказаць дзеепрыметнік ці дзеепрыслоўе як формы дзеяслова, якія часта блытаюць вучні, патрэбна даказаць. Доказ пачынаецца з аргумента тыпу *Па-мойму, гэта дзеепрыметнік.* А затым выстройваецца лагічная сістэма аргументаў тыпу наступных:

*Па-першае, дзеепрыметнік абазначае прыкмету прадмета паводле дзеяння і адказвае на пытанні які? якая? якое? якія?, а*

*дзеепрыслоўе абазначае дадатковае дзеянне і адказвае на пытанні як? калі? чаму? і інш. Па-другое, дзеепрыметнік, хоць і можа быць закончанага ці незакончанага трывання, як і дзеепрыслоўе, але змяняецца па родах і ліках, дзеепрыслоўе не змяняецца. Па-трэцяе, дзеепрыметнік у сказе выконвае ролю азначэння ці выказніка і дапасуецца да назоўніка, а дзеепрыслоўе звычайна выконвае ролю акалічнасцей. Па-чацвёртае, у дзеепрыметніках выдзяляюцца суфіксы -л-, -т-, н-, -ан- -ен-, а ў дзеепрыслоўях – -учы / -учы, -ачы / -ячы, -ўшы, -шы.*

І ў заключэнне – вывад: *Такім чынам, дадзенае слова – дзеепрыметнік.*

У выніку вучням зразумела роля пабочных слоў.

Такім чынам, адной з задач школы ў дэмакратычнай дзяржаве, як адзначае вядомы даследчык мовы А.Я. Міхневіч – “рыхтаваць грамадзяніна, мова якога выяўляе ўсе яго лепшыя духоўныя якасці, выхоўваць homo loquens” [2, с. 180]. А для гэтага, а значыць і выканання задачы навучання беларускай мове, калі найперш патрэбна развіваць моўную асобу, якая магла б успрымаць інфармацыю, правільна, у адпаведнасці з умовамі маўленчых зносін, мэтамі і адрасатам несці сваю інфармацыю, умець выказаць думку, весці дыялог, падрыхтаваць выказванне, ажыццявіць вуснае выступленне і інш., неабходна пастаянная работа настаўніка на ўроках беларускай мовы па развіцці маўлення, у сістэме якой належнае месца павінна заняць работа з тэкстам, гатовым і новым.

Літаратура


1. Литвинко, Ф.М. Методика изучения разделов школьного курса русского языка (функциональный подход): Курс лекций для студентов филологического факультета. – Минск: БГУ, 2001. – 175 с.
2. Міхневіч, А.Я. Homo loquens – чалавек, які гаворыць// А.Я. Міхневіч. Выбраныя працы. Агульн. рэд. С.А. Важнік. – Мінск: Права і эканоміка, 2006. – С. 175-180.
3. Цікоцкі, М.Я. Стылістыка тэксту / М.Я. Цікоцкі. – Мінск: Беларуская навука, 2002. – 223 с.

## ЗМЕСТ


| | | |
|---|---|---|
| Уводзіны | | 3 |
| **1** | Прыкметы тэксту | 5 |
| **1.1** | Члянімасць тэксту | 9 |
| **2** | Выкарыстанне тэкстаў у навучанні беларускай мове | 15 |
| **2.1** | Праца над тэкстам і вывучэнне сінонімаў і антонімаў | 16 |
| **2.2** | Месца і роля розных часцін мовы ў тэксце | 26 |
| | *Назоўнік* | 26 |
| | *Прыметнік* | 34 |
| | *Займеннік* | 38 |
| | *Дзеяслоў* | 45 |
| | *Прыслоўе* | 50 |
| | *Злучнік* | 55 |
| **2.3** | Роля і месца пабочных слоў у тэксце | 60 |
| Літаратура | | 63 |
| Змест | | 64 |

Вучэбнае выданне

**ЛЯШЧЫНСКАЯ** Вольга Аляксееўна

# ТЭКСТ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Практычны дапаможнік
*для студэнтаў*
*філалагічных спецыяльнасцей ВНУ*

**У аўтарскай рэдакцыі**

Камп'ютарная вёрстка і дызайн В. А. Абраменка

Ліцэнзія № 02330/0133208 ад 30.04.04.
Падпісана ў друк 25.06.08. Фармат $60\times84^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 1. Гарнітура “Таймс”. Умоўн.-друк. арк. 3,72.
Улік.-выд. арк. 4,0. Тыраж 50 экз. Заказ № 69.

Аддрукавана з арыгінала-макета на рызографе
ўстановы адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Францыска Скарыны”.
Ліцэнзія № 02330/0056611 ад 16.02.04.
246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104